Званы ў прадоннях азёр

Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч

SHOUT
SHARE
IT

- Уладзімір Караткевіч
  -
  - I. Пачатак ласкавага чэрвеня
  - II. Плывучы манастыр
  - III. Мая рака
  - IV. Брама ў Палессе, або "и разошлись, как в море корабли"
  - V. Бакены з рыбай
  - VI. Міні-Кіеў
  - VII. Востры водар лазы
  - VIII. Паданне пра караля буслоў
  - IX. Пагарынская Венецыя
  - X. Вярхоўны цыганскі суддзя
  - XI. Што такое "бусько"
  - XII. Мір вам!
  - XIII. Нараджэнне песні. Нараджэнне жыцця
  - XIV. Ціхі вечар
  - XV. Сухі шлях
  - XVI. Пінская даўніна
  - XVII. "Адам быў злеплены з гліны…"
  - XVIII. Кароль уюноў, або некалькі марных думак аб Пінску
  - XIX. Семдзесят пяць анёлау з гакам
  - XX. Адзін на палескіх шляхах
  - XXI. Адраджэнне
  - XXII. Напяты світанак. Брэст
  - XXIII. Ізноў гавораць званы
  -
- notes
  - 1

Уладзімір Караткевіч
Званы ў прадоннях азёр

Кажуць балады Палесся,
Што ў даўнія злыя гады
У правалах танулі замкі,
Цэрквы і гарады.
Азёры ўставалі над шпілямі,
Палі залізваў разліў,
І рыбкі ў байніцы вежаў
Сотняй вясёлак плылі.
Але кажуць дасюль, што ў прадоннях,
Над якімі бяжыць чарот,
Жывы ў гарадах падводных
Стары палескі народ.
Жывыя яго паданні,
І песня, і мовы строй
У недасяжных глыбінях,
Пад сіняй азёрнай вадой.
Яны зберагаюць скарбы
За сябе і за нас ўсіх,
А мы цягнем свой крыж штодзённы,
І мы забываем іх.
Але дзень настае, калі раптам
На світанні, нібыта праз сон,
З даляў блакітных мы чуем
Ціхі падводны звон.
Гэта значыць, што з вежаў нябачных,
Праз світанак над мокрай лазой
Клічуць жывых супакутваць
Званы ў прадоннях азёр:
"Прыйдзіце, каб нам убачыць
На беразе кветку агню.
У нас замест птушак — рыбы,
Багноўкі — замест ячмяню.
Але мы зберагаем Сэрца.
Але нашы й вашы грахі
Выкупляем мы ў прорвах азёраў,
Як калісьці ў пажарах ліхіх.
Прыйдзіце. І словам продкаў

Вады ўскалыхніце свінец,
Каб ведаць, што вы — жывыя,
Што мы недарэмна — на дне.
Што мы недарэмна чакаем,
Калі на паверхню зямлі
Узрынуць, амытыя хвалямі,
Белых званіц караблі.
І звон залунае вясёлы,
І светла ўдараць званы
Над агульнымі вечнымі сёламі
Нас, азёрных, і вас, зямных".
. . . . . .
Калі захлынаецца песня,
Адчаем туманіцца зор, —
Клічуць душу на Палессе
Званы з прадонняў азёр.

I. Пачатак ласкавага чэрвеня

На самым пачатку ласкавага чэрвеня званы паклікалі з Мінска адразу трох чалавек. Штопраўда, аднаго, — а імя яму было, да вашага ведама, Зянон, — адначасова паклікалі і другія, браслаўскія, званы, і ён павінен быў прыяднацца да астатніх бадзяг пазней, недзе ў Мазыры. Мы вымушаны былі змірыцца з гэтым, хаця адсутнасць мастацтвазнаўцы рабіла нашу экспедыцыю крыху непаўнацэннай і, ва ўсякім разе, змяншала нашу самапавагу. Але нічога зрабіць было нельга: мастацтвазнаўцы ёсць самыя неарганізаваныя людзі на гэтай і без таго неарганізаванай зямлі.

Астатнія два былі крыху больш арганізаваныя. І вось яны, журналіст Валянцін і літаратар Уладзімір, ваш пакорлівы слуга, у належны дзень узброіліся фотаапаратамі, рукзакамі, вудамі і мужнасцю і годна ўзышлі на борт паветранага лайнера Мінск — Гомель. Выгляд у гэтых двох быў дужа неавантажны: патрапаныя курткі, нагавіцы, якія прымушалі жадаць лепшага, а на адным яшчэ і кірзавыя боты. Толькі першакласная тэхніка журналіста давала некаторае паняцце, што гэта культурныя людзі, а не басякі.

Лайнер скокнуў і высадзіў іх у старажытным горадзе на Сажы, дзе ўжо чакаў агітпараход "Маякоўскі", на якім яны павінны былі адплысці ў "краіну Палессе", зрабіць першы этап падарожжа, каб пасля ўжо самім біць ногі на нямераных палескіх дарогах.

Гомель купаўся ў сонцы, чалавечых усмешках, лістоце славутых сваіх паркаў і ў свежай фарбе на мурах свежаадрамантаваных дамоў. Не хапала толькі букетаў і хлеба-солі, якія падносіць гераічным даследчыкам і першапраходцам прыгожая супрацоўніца аэрапорта. Дабраліся мы да прычала, дзе проста ля берага прыткнуўся наш плывучы дом, кінулі рукзакі ў лялечную каюту (два ложкі і паліца для таго, хто спазніўся, бо хто позна прыходзіць — косці знаходзіць і сам сабе шкодзіць) і выбраліся ў горад.

…Усе вы былі ў Гомелі, так што не трэба пераконваць, што гэта за горад, і ў тым, што "і за Гомлем людзі е", не трэба расказваць, што такое добры Сож, белакаменны палац над ім, гэтыя алеі і вуліцы. Не трэба расказваць і пра тое, што менавіта ў палацы склалася калісьці ядро маскоўскай бібліятэкі Леніна.

Так што пра горад — толькі па неабходнасці. Пра шэрыя пляжы, на якіх сядзяць у абдымку закаханыя, пра змрочную магільню Паскевічаў, дзе ляжаць доўгавалосыя мумііі, пра рупныя

рукі страхароў, тынкоўшчыкаў і майстроў "па драўлянай частцы", якія рэстаўруюць гэтую магільню, і пра разумных прарабаў па "спецыяльнай навуковай рэстаўрацыі".

І не трэба нічога расказваць пра лапчастыя каштаны, апетыя і без таго сотнямі паэтаў, і пра выключныя пейзажы з балкона вежы, і пра тое, што журналістаў трэба трымаць за порткі, калі яны, у пошуках лепшага ракурсу, звешваюцца з гэтага балкона галавою ўніз, рызыкуючы згубіць акуляры, а заадно — і галаву.

Гораду проста трэба сказаць дзякуй за падараваную любоў, за адзеты каменем бераг, па якім, рызыкуючы паламаць ногі, прабіраешся светлай летняй ноччу на свой параход, за бязлюдна шэрыя, сумныя, як харошы верш, пустыя вуліцы і плошчы перад світаннем і за апошні ўзмах рукі на развітанне яму.

На развітанне, за якім пачалася новая краіна, прага і кліч нашага закаханага сэрца.

II. Плывучы манастыр

Абедзве журналісткі, якія павінны былі ўваходзіць у нашу групу, у апошні момант адмовіліся ехаць, спасылаючыся на больш-менш неаб'ектыўныя прычы ны. Такія ўжо таямніцы жаночай душы!

Таму мы накіраваліся ў наш прыгожы паход па старую палескую культуру адны, як то і належыць крыжаносцам. І каб не наш мілы летні кок — Амяльянаўна, — на караблі ўвогуле не было б ніводнай кабеты.

Мужны і суровы дух першых вікінгаў валодаў намі. Свет, дзе не было месца сантыментам і слінцяйству. А было нас спачатку восем чалавек, малайчына ды малайчына. Усе, акрамя Амяльянаўны, удалыя хлопцы і ўсе бацькавічы,

Спіс каманды з кароткімі паслужнымі дадзенымі:

1. Глышкін Мікалай Фёдаравіч, начальнік па агітацыйнай частцы, заўзяты, да забыцця сну і ежы, рыбалоў з усім, што адсюль вынікае (хай даруе мне бог, я так і не аддаў яму дзесятка рыбалоўных — першакласных! замежных! — кручкоў, якія бессаромна ў яго пазычыў, бо сваіх не хапіла).

2. Кірыльчанка Андрэй Іванавіч, з якога б і пачынаць, бо гэта капітан, суровы рачны воўк, знаўца фарватэру і людзей.

3. Намеснік капітана Толя. Па бацьку Фадзеевіч. Астатняе вывудзіць не ўдалося. Чарнявы і гожы ўлюбёнец усіх агітуемых па дэбаркадэрах і вёсках (ну, наконт некаторай часткі хлопцаў я гэтага, вядома, не скажу, а скажу толькі наконт прыгожай паловы роду чалавечага). Па сумяшчальніцтву — кінамеханік.

4. Амяльянаўна. Кок, які з нашай рыбы і нашага шчаўя, плюс сваё мастацтва, рабіла дзівы, ад якіх язык праглынаеш (вы яшчэ пераканаецеся, на сваё няшчасце, я яго не праглынуў).

5-6. Грыша і Алёша, матросы-практыканты. Маўклівыя рачныя ваўчаняты, з якімі — хоць на полюс.

7. Валянцін. Журналіст. Фоталетапісец вылазкі. Чалавек з тых, што ахвотна здымаюць, звісаючы з вежы або шасі верталёта.

8. Каб не рызыкаваць сваёй рэпутацыяй, звесткі пра сябе я рассею на працягу ўсяго апавядання.

9. Параход. Маленечкая акуратная шкарлупінка. Жывая. З рухавіком, вінтамі, падвясным кінаэкранам. З голасам. Бадзёрым раніцаю і сонным над соннай вячэрняй вадой.

Пятага чэрвеня 1969 года, у суботу, роўна ў 11 гадзін 8 хвілін плывучы манастыр накіраваўся ў свой слаўны шлях. Прагудзеў гораду, зялёным адхонам і дамам, лебедзям у ставах і вежам.

…І адразу пайшла Рака. З'ява, без якой я не ўяўляю свайго жыцця. Якая і ёсць гэтае самае жыццё: з нараджэннем, сонцам і хмаркамі, з тлустай рыбай і шафраннымі захадамі. І, урэшце, з прадвызначаным канцом.

Хвалі. Хвалі. Усе першыя дні крыху пахмурыя хвалі. Вязуць на барках штабялі пацямнелых, амаль чорных бярвенняў. Лунае над імі прывязаны на мачце, расчалены, каб не трапала ветрам, чырвона-зялёны сцяг. Імчыць насустрач гэтым змрочным кастрам "Ракета", і ззаду за ёю палошчацца ражком брызентавы чахол.

Імчыць, як вядзьмарка на мятле.

І пайшлі рудыя, жалезняковыя, вапняковыя берагі з гнёздамі бераговак. Усе паточаныя, васпаватыя. Усе, як паменшаная копія ўцёса Сценькі Разіна. І свінцовая, як восенню, вада б'ецца аб іх. І дрымучая, старажытная, баладная журба просіцца ў сэрца. І няма нават персідскай княжны, каб яе ўтапіць.

А вакол усё ж шчаслівая Аркадыя, няхай сабе і пад змрочным небам. Зялёнае трапятанне дубовых хмар, плывучае мора чароту.

Сцежка вядзе. Куды?

Чароды на нізкіх берагах. Што яны думаюць, сочачы за намі і раняючы сытую сліну?

Дзядзька доіць карову. Ага, нашчадак таго мужыка ў Альберта Паўловіча, які таргаваў карову на кірмашы і, даведаўшыся, што яна слухмяная і не наравістая, а брухае насмерць толькі тады, як яе доіш, сказаў, што гэта яшчэ лепей, бо даіць давядзецца не яму, а жонцы.

Малайчына!

Сачыў бы за дубамі бясконца. Ніводны нельга зблытаць з другім. Вось адзін, зялёна-сакавіты, падобны па форме на костку тырчком. А побач другі, амаль аднолькавы, але ўжо як рассечанае сэрца, раскрытае насустрач небу. Той поўна-зялёны, а той амаль празрысты. І з-пад ног гэтых вечных, гэтых палескіх, гэтых нашых дубоў зялёнае мора дзірвану спаўзае ў раку: плямамі на грыфельным. Зверху свежазялёны, ніжэй травяністы, падмочаны, а яшчэ ніжэй, ля вады, буры.

І адкрылася Палессе. Адкрылася тым, што тры ласі пераплывалі Сож, выставіўшы над вадою гарбаносыя галовы. Вы ыіколі не ўзважвалі на руцэ ласіны рог? Дык вось, першы спосаб утапіцца — гэта прывязаць яго на галаву і паспрабаваць пераплысці хаця б Проню ля яе вытокаў.

Гэтыя плылі, як багі. Як стрэлы. Як дэльфіны.

А пераплыўшы, пачуўшы гоман вінтоў, ірванулі на сваіх хадулях — аж затрашчала лаза. Нават пазіраваць перад аб'ектывам не схацелі. Была ва ўсім гэтым такая першабытная дасканаласць і прыгажосць, што сціснула сэрца.

Баюся, што складанага апавядання ў мяне не атрымаецца. Проста таму, што не апішаш гэтыя мачтавыя, бронзавыя бары над вярбовымі адхонамі, гэтыя пахучыя, зморшчаныя познія смарчкі высакародна-карычневага, аксамітнага колеру, гэтую ідылію першай прыстані. Астраўкоў (Астраўкі!) з драўлянымі сходамі да дэбаркадэра, гэтыя патрэсканыя гумны ў ценю велізарных, у познім цвіценні, груш.

Ох, што там, за гэтай ідыліяй, да нас, мімаходных!

Ані д'ябла мы не ўмелі. І прычальваў наш параходзік да нейкага там Радуля ў лепшым выпадку пад "Тр-ры кар-рты" з "Пікавай дамы", а то і пад гукі бессмяротнай, як усякая выпушчаная мільённым тыражом пошасць, "Лады".

"П-под жел-лезный звон коль-чу-ги".

Я сам люблю кальчугі, - нездарма гісторык, — толькі не папяровыя і не пластмасавыя.

"Хмуриться не нада, Л-ла-а-да!"

Алёша ў зялёным пінжаку саскоквае на бераг і забівае ў пясок жалезную свайку, ломік, каб швартавацца. З палубы лянівы голас капітана:

— Ён жа яго ў Амерыку загоніць…

І сапраўды, пры такім старанні і да Амерыкі недалёка. А на самай справе, цікава было б, каб ломік вылез праз асфальт недзе побач са статуяй Свабоды. Ото быў бы газетны і палітычны шквал наконт падступных падкопаў і інтрыг!

Выбух халоднай вайны. А вінаваты — Алёша…

Халоднай вайны не адбылося. Адбыўся сеанс у цеснаватай параходнай зале. Не помню ўжо, ці то прыгоды славутага Івана Макарэвіча, ці то прыгоды дзяцей на паўночным птушыным востраве. І такія ж дзеці сядзелі, шморгаючы насамі ад хвалявання, а брывастыя дзяўчаты (о, манастыр-манастыр!) чысценька лузалі ў адзін кулак семкі, а другім камячылі ражкі хустак на грудзях. А пасля іх праводзілі па сходнях, галантна трымаючы замест парэнчаў доўгую лату. І дзеўкі павісквалі над чорнай вадой, і іх, пасля ліхтарыкаў, чакала ноч, рыпенне драча, пах лазы, а можа, і моцная рука, што туліць да сябе за плечы. Э-эх, манастыр-манастыр!

III. Мая рака

Добра, што ноччу мы не плылі, а стаялі недзе ля вёскі ці проста ўторкнуўшыся ў бераг. Такім чынам, бачыў я кожны дзюйм, кожную цалю таго берага, ля якога мы праплывалі.

І скажу вам: прыўкрасны дубовы Сож, багацей за ўсё на свеце рыбаю плёсы Прыпяці. Але другой ракі за маю раку, за мой сонечны, за мой суровы і шырокі, за мой старажытны Дняпро — другой такой ракі на свеце няма.

Ясна, што ён неласкавы, што кожны год ён, як кожны бог, павінен узяць хаця адну ахвяру. Але ён карміў, корміць і давеку будзе карміць нас, ягоных сыноў і дачок, ён даў нам шырыню душы і размах думкі, ён… ён проста Рака, што адзіная такая на зямлі.

З броханнем самоў і браканьерамі, з курганамі ў квецені шыпшыны і разлівам бэзу на котлішчах, з памяццю пра жалезных варагаў і сталёвых старых і новых беларусаў.

Ён — бацька. Ён калыска наша. Ягоная душа — наша душа, усё яшчэ нястрымная, язычаская, вераломна-праўдзівая, цыганская. Ён і сапраўды язычнік, мнагажонец, і ўсе жонкі ягоныя не чуюць у ім душы. І Друць, і Прыпяць, і Дзясна. А браты ягоныя і сябры, накшталт Сажа, таксама не чуюць у ім душы. Бо гэты не выдасць. Бо ён верны сябар, які не заложыць цябе ўсякай свінні.

Бо ён — Рака.

Амаль невераемная шырыня ўладна рухалася некуды. Стары працаваў, каб напаіць сотні земляў,

накарміць тысячы людзей і птушак, нагадаваць нялічаныя легіёны рыб.

Я якраз рабіў замах на тых рыб. Шчыра кажучы, не дужа паспяховы. Але ж справа была не ў гэтым. Справа была у тым, што курэла рака і шурпатыя акуні з блакітнымі шчупачкамі дыхалі жабрамі ў маленькіх вымачынках між зарасцяў ліловых і залатых дэкадэнцкіх касачоў. І ў касачоў былі мяккія вусны, вычварна загнутыя, пушыстыя.

Я люблю касачы. Беларускія архідэі.

Яны цвілі шалёна над морам разнатраўя.

Чаго тут не было! Аж да круглалістай расіцы (Drossera roturdisotia), якая — хай гэта будзе вам вядома! — дужа дапамагае ад няшчаснага кахання. Рэцэпт — даць у страве ці зашыць у адзенне. Я-то, праўда, сам не спрабаваў, але, як лёс мне тое няшчаснае каханне (толькі яго мне ў маім шматпакутным жыцці і не хапала) — пашле, — абавязкова паспрабую.

Ліны, як пацьмянелае меднае блюда, гладкія, з высакароднай буйной луской — хоць глядзіся ў іх — таўстахвостыя. Сырымі еў бы. Але кручок увесь час налязае на чапу, і, паколькі я не люблю губляць кручкоў, трэба распранацца і плысці адчапляць ад тоўстых, плямаватых, як пітоны, каранёў лілей.

А потым амаль марскі разліў з сапраўднымі марскімі бакенамі на створы. Месца, дзе ў абдоймы да майго віцязя прыходзіць Прыпяць і неразрыўна, навекі зліваецца з ім. Караблі, рудавозы ў туманным вэлюме, белыя, крыклівыя хусціны чаек, напаўзатопленыя астравы.

Абшар! Бог мой, які абшар!

IV. Брама ў Палессе, або "и разошлись, как в море корабли"

Палі амаль затопленай хаткі бакеншчыка. І над усім халодны вечар. Шэра-блакітнае, бясколернае бязмежжа.

Кавалачак украінскага Палесся, Зялёны Чарнобыль з царквою XVIII стагоддзя (абразы нікуды не вартыя), з ціхім рынкам і мяккім пылам на вуліцах. Вялізныя грушы на вуліцах (наш галоўны агітатар чамусьці палічыў адну за грэцкі арэх).

І ледзь не канец падарожжа. Рудавоз РС-09. Харошы рудавоз. У маі выканаў план на 115 працэнтаў. Капітан — казак з вёскі Мысы, якую мы праплывалі, Васіль Антонавіч Бычок, сімпатычны дзядзька, апрануты надзвычай сціпла. Але нас цікавіў не толькі капітан.

Палессе з самага пачатку паказала нам святы ўзор сваёй прыгажосці ў асобе кока з рудавоза, маладзенькай дзяўчыны, што скончыла школу кокаў у Пінску. І ледзь не паляцеў увесь наш манастыр да ўсіх д'яблаў.

Аблічча казачнай царыцы. Хада — хмарка плыве. Усмешка — сонца ззяе. Зваць Тамарай, прозвішча не скажу. Ну вас!.. І так адбою не будзе, а мне непрыемна…

Пакуль на рудавоз перадавалі кнігі пра шпіёнаў, мы знішчылі па цэлай фотаплёнцы і засумавалі. Матухна мая, дзе ж дагэтуль, якімі такімі дарогамі вадзіў нас нялітасцівы, няўблажны беларускі лёс! Як магло мне ўсміхацца сонца!

Варта было б учыніць бунт на караблі, пад пагрозай зброі прымусіць капітана прышвартавацца да РС-09 і плысці, узяўшы тое судна на абардаж. І адбіваць атакі зайздроснікаў.

Шчыра кажучы, мы так бы і засталіся тут, і не было б плывучага манастыра, і не было б Прыпяці. І, можа, варта было б.

Але перамог, як у класіцыстаў, абавязак. І замучыў ён няшчасную любоў. І адвалілі мы ад рудавоза і доўга яшчэ глядзелі назад, як быццам маглі нешта бачыць. "И разошлись, как в море корабли", няведама якому чорту на радасць, а сабе на смутак.

Але Палессе ўсё ж глянула на нас. Першым, самым яркім промнем сонца. Глянула дый знікла.

І аднойчы сасніўся ёй дзіўны сон,
Майскі лес, паплавы і зямля,
І адчула далёкі надводны звон
Лілафея, дачка караля.

А можа, яна і сапраўды з'явілася на хвіліну з падводнага горада?

V. Бакены з рыбай

Ужо зноў Беларусь. Шырокая, спакойная Прыпяць.

На пясчаных адхонах, пад дрэвамі, навенечкія домікі, крытыя шыферам. Падобныя, бадай, да ўсіх новых хат на Беларусі і таму, як красамоўна выказаўся Валянцін, — "не фантан!".

Але затое якія берагі, умацаваныя пляцёнкамі і свежанькай лазою, якія белыя-белыя коні на паплавах! Глядзяць, як гуінгмы ў Свіфта, з высакамерствам і кепска схаванай пагардай. І які ідзе паўз нас плывучы магазін з дробным часцікам, акавітай, журавінавым напіткам.

Адсюль відаць ужо і Нароўлю. Але блізка відаць, ды далёка дыбаць. Прыпяць тут вераломная, як паэтэса: паваротка на паваротцы.

Нароўля таксама калісьці належала Паскевічам. У ёй ёсць нічым нецікавы позні палац, прыгожы стары парк з векавымі дубамі, ліпамі і клёнамі, увесь парэзаны пратокамі з цёмнай вадой, і здалёк яшчэ бачная альтанка, белакаменная, дзіўна струнка свечачка з XIX стагоддзя. Лёгкая, са скразнымі праёмамі, з ладнымі калонамі, увенчаная зграбным купалком. Дзіва. А вакол зелень і цень. А ля ног — рака з каравымі, таўшчэзнымі стваламі вярбы, выкінутымі на пясок.

Пра альтанку, ясна ж, ходзяць розныя байкі. Нібыта пахаваны пад ёю ўлюбёны панаў сабака і нават партрэт ягоны (сабакі, а не пана) выкарбаваны на муры. Я, аднак, разгледзеў гэты партрэт і пераканаўся, што гэта не сабака, а проста здорава папсуты барэльеф савінай галавы. Сава — сімвал мудрасці. І, значыць, альтанка проста была месцам, дзе можна сядзець і думаць. Як сказаў бы Манілаў — "храмом уединенного размышления".

…О, рака-рака!.. Пясчаныя косы, і зялёныя горы, і змеі каранёў на іх.

Рыбакі, што злавілі на дне чаўна "жывы волас" і цяпер з дзіцячай цікаўнасцю дзеляць яго на лопасці вясла нажом на часткі, "а кожная частка жыве". І ўсім цікава да апошняга, нават белай з чорнымі вачыма сучцы — Розе.

Пад'язджае бакеншчык. У яго з рыбакамі ўзаемаразуменне. Рыбак раніцаю гасіць яму самы далёкі бакен. А заадно накладае ў яго рыбы. Вечарам, калі ён запальвае бакен, рыбы ў ім ужо няма, але затое ляжыць чвірка ці бутэлька "чарніла". Добра і аднаму і другому.

І пагойдваюцца на хвалях бакены з рыбай.

VI. Міні-Кіеў

Горад на зялёных адхонах. Яры, над якімі хіляцца дрэвы. Цукровая бель старых цэркваў і манастыроў праз сець галін. Мазыр. Міні-Кіеў. Падабенства і сапраўды надзвычайнае. Усё, праўда, крыху меншае. І стромы, і дрэвы, і вежы касцёлаў. Але нешта агульна-мяккае, лірычна-вясёлае, сціплае і добрае — яно тут. І старажытнасць таксама тут. Сярэдзіна XII стагоддзя. Адвечнае імкненне да Турава і Пінска, да братоў-дрыгвічан. Вечныя сутычкі з татарамі і літоўцамі, паўстанні, страта Янушам Радзівілам Міхненкі, што так доўга трымаў горад супраць каралеўскіх сіл. У XVIII стагоддзі паўстанне мазырскіх сялян пагражала ўзняць пад косы і паходні ўсю Беларусь.

Шмат было крыві. Але ўсё ж ясная ўсмешка засталася на прыгожых вуснах горада. І светла дрыжаць на ягоных гарах дрэвы.

Я люблю гэты горад здаўна. Люблю бескарысліва і назаўсёды, і заўжды рад вярнуцца ў яго. Гэта тут, у наваколлях ягоных, я сустрэўся з цар-дубам. Я яшчэ раз зразумеў тады, што такое мая зямля і якое маё месца на ёй.

З самага пачатку яе дзён, з тых часоў, калі княгіня Вольга, ідучы на драўлян, загадала выбіць пад гэтым самым Мазыром "зоўжыны студні".

Шанцавала мне тут на мядзведзяў. Першы раз на кіношных, другі — на мядзведзяў са звярынца. Купіў ім батон і цукру, думаючы, што, пэўна, і мой бедны Міхась сядзіць зараз у клетцы і яго таксама нехта накорміць. Страшнае гэта ўсё ж відовішча, звярынец. І які чорт мог загнаць туды капітана, Валянціна і мяне!

Уяўляеце, буслы ў клетцы. Калі ледзь не на кожнай палескай хаце ляскае дзюбай жывы, вольны бусел, абліты барвай захаду. А тут бусел браў у мяне з рук хлеб. І ў адной клетцы гулялі лісяняты з пеўнем і кацяняткам. "Куток маладняка"… Фу! Вялікае няшчасце чалавека — адбіраць у жывога свабоду. За гэта і плаціўся стагоддзямі гэты самы чалавек.

Чамусьці заўсёды шанцавала мне ў Мазыры і на навальніцы. Траскучыя, як разнос у шэфа, грымлівыя, з праліўным дажджом, калі няма чым дыхаць, з яраснай сечай маланак, з пясчанымі рэкамі, якія равуць ярамі. Навальніцы тут жудасныя. Адна старая бабка тлумачыла гэта тым, што жанчыны перасталі насіць хусткі і валасы "прыцягваюць електрычство". Тлумачэнне, па-мойму, не горшае, чым у многіх навуковых працах.

…І стала пахмурая раніца. Зноў пахмурая, нібы неба не выліла за адну гэтую вераб'іную ноч усяго запасу дажджу.

Рака злавалася. Несла дном таплякі і ўсякую брыду. Уначы ледзь не патанула баржа з рудой. Загінуў адзін матрос, і пашкодзіўся ў розуме стырнавы. Мы везлі на тую баржу чалавека: расследаваць. Дарогаю ледзь не здарылася яшчэ бяда. Стырнавы нейкага маторнага чаўна "злавіў гаву", не паспеў паставіць чаўна носам да нашай хвалі, і човен той перакуліўся. Людзей вылавілі. Кожная вада не любіць жартаваць і не церпіць няўмелых. Бяспека гэтай ціхай вады і жыцця на ёй — дужа ўяўная. Гінуў і гіне чалавек ад сутыкнення з кожнай стыхіяй. Таму павінен паважаць тое асяроддзе, сярод якога жыве. Не чапаць ані дрэва, ані пратокі, калі на гэта няма самай пільнай патрэбы.

VII. Востры водар лазы

Яшчэ і яшчэ глыбей. Пляскаta, у раскошных дрэвах над межытокамі канчаецца мазырская града. Спускаюцца на Прыпяць шэрыя, ласкавыя вечары з мараннем туманна-зялёных дрэў, з рэдкім палётам "Ракеты" і задуменным бязлюддзем рэдкіх вёсак.

Назвы палескіх вёсак — музыка ў ціхім сэрцы. Акулінкі, Стрэльск, Навасёлкі.

Хутка мы развітаемся з табою, Прыпяць. І таму вочы асабліва востра заўважаюць усё, асабліва відушча разглядаюць твой незабыўны твар. Гэтыя штабялі бярвенняў ля млынка, рыжыя зверху, цёмна-бурыя знізу (туды даставаў летні разліў), і гэты плывучы кран, што дастае з дна шматвяковыя дубы, і мотапаром, які вязе два грузавікі, іначай не праедзеш ад адной вёскі да другой. Два чаўны, злучаныя платформай, і катэр цягне іх, а з аднаго чаўна вычэрпваюць вядром тарфяную ваду.

Нам добра бачыць паром, вялізную чаргу машын і "Беларусаў", што чакаюць пераезду і дарогі на Тураў, але нам таксама добра і цікава бачыць хлопчыка, што цягне па вадзе на водмель веласіпед, і флатылію гусей з малымі шэрымі гусяняткамі. Старыя абкружаюць іх. І — ух! — як жа іх загойдала на хвалі ад нашага парахода!

Востры водар лазы і над Туравам, дзе нас, урэшце, дагнаў з рэшткамі апаратуры наш мастацтвазнаўца, сябар Зянон уласнай персонай. А мы ж толькі радаваліся пры думцы аб тым, як некалькі начэй ён будзе спаць на паліцы і куды ён пры гэтым падзене свае цыбатыя ногі.

…Самае сумнае ўражанне за ўсю дарогу. Тураў. Проста — вялікая вёска. Перажыў сябе. Горад, які трымаў у сваіх руках гандаль Кіева з Польшчай. Сталіца Вялікага княства, куды ўваходзілі Пінск і Нясвіж, Рагачоў і Ваўкавыск. Спалены татарамі (легенда кажа, што яны закідалі дзецьмі Тур-калодзеж, пасля чаго сем год з таго, замест вады, біла жаночае малако), выпалены літоўцамі і палякамі, горад так і не ўзняўся. І ніякіх слядоў велічы. Стагоддзі нарадзілі, стагоддзі і сцерлі. Засталося адно тое, што не тлее і не гарыць. Слова. Слова "другога Златавуста", вялікага Кірылы Тураўскага. Ды яшчэ валы і равы на Туравай гары. Гэтыя маўчаць. Слова больш даўгавечная рэч, чым муры і мячы. Яны гінуць, слова — жыве, нават калі вялікія сталіцы засынаюць на грані небыцця. Гэта трэба добра помніць. Усім.

Адплывалі. Сонца было злева. Навальнічная хмара стаяла над горадам, ішла на яго, на нас. Срэбныя, дробныя бліскаўкі сонца

трапяталі на ліловай вадзе і цьмяна-срэбных плямах пены. А над усім сутыкаліся дзве цёмна-сінія хмары, як два мячы. Пад імі клубіліся жамчужна-белыя аблокі, а ў іх малюткім ясна-сінім вочкам палыхаў лапічак неба.

Я стаяў ля борта і ўспамінаў словы вялікага Кірылы, якія не пастарэлі за восемсот з лішнім гадоў:

"Ныня сонца красуяся… усходзіць і радуюся зямлю аграваe. Ныня… зіма прэстала ёсць і лёд… растаяся… Дзесь вясна красуецца, ажыўляючы зямное есцьство; бурніі ветры, ціха павяваюшчэ, плады цалуюць… Ныня наваражаеміі агнцы і унці, быстра пуць пярушчэ, скачюць і, скора к мацерэм взврашчаючэся, весяляцьця… Ныня ўсю дабрагласныя пціца… гнездзяшэся весяляцьця… і сваю кожная паюшчы песнь, славіць бога гласы нямоўнымі".

Слова не пастарэла. Адно толькі Слова, настоенае на водары садоў і горкай вярбовай кары.

VIII. Паданне пра караля буслоў

Той дзень быў апошні дзень Прыпяці. Працавалі толькі мы трох ды Толя за штурвалам у рубцы. Я палез да яго, і сталі глядзець на берагі, на дубровы, што цягнуцца берагамі да самага вусця Случы і далей.

Размова, аднак, і тут была невясёлая. Можа, таму, што так прыгожа было вакол, што Прыпяць і дагэтуль звярыная і рыбная. Зайшла ў нас размова пра тое, а ці доўга яшчэ існаваць такой раскошы на беларускай зямлі, аб тым, як слепа часам умешваецца чалавек у вечныя справы прыроды.

І як, магчыма, за нашу каротказорасць давядзецца плаціць нашчадкам, а можа, і нам самім — запраграміраваным калісьці для святла сонца, чыстай зелені і чыстай вады. І не для таго, каб разбураць і нішчыць прыроду, не дзеля таго, каб за чалавекам заставалася пустыня, а для таго, каб памятаць: чалавек толькі невялікая частка цэлага, імя якому — жыццё. Дрэва не можа напасці на чалавека. Барацьба яго з сабе падобнымі непрыкметная для вока чалавечага. І таму мы адпачываем, гледзячы на дрэвы і траву. Ідыёцкі аптымізм, што "ўсяго яшчэ многа", па меншай меры беспадстаўны. Ужо зараз найбольш відушчыя людзі падымаюць голас у абарону тых самых балот, якія мы так няўмела, па-драпежніцку асушалі. Падае слой падглебавых вод — і сохнуць навакольныя лясы, карані якіх не могуць так хутка зноў дабрацца да вады. Асушылі балоты ў Ламбардыі — і нашым качкам няма дзе зімаваць. Асушылі на Палессі — і ім няма дзе выводзіць дзяцей. Знікае від. І пачаў раскручвацца ланцуг ад жывёлы да жывёлы, канчаючы аж самім чалавекам.

Толя расказаў, як пасля сенакосу знішчалі гербіцыдамі з самалётаў чорную лазу. Знішчылі, вядома, лістоту (якая адрасце на наступны год, калі тую лазу — а чым яна, дарэчы, вінавата? — не карчаваць, аб чым амаль ніхто не падумаў).

І вось у навакольных гаях ляжалі раздутыя, здохлыя ласі, у сітнягах смярдзелі качкі, білі крыламі, паступова заміраючы, буслы. Па вадзе плыла масляністая каша, і нельга было есці злоўленую рыбу.

Бралі па дзесяць тысяч з калгаса за псаванне прыроды, за злачынства, калі ўжо так разабрацца.

Лесавод у Белавежы расказваў мне, што лесанарыхтоўчыя арганізацыі дабіліся дазволу на буйныя высечкі лесу на Бярозерацэ. Лес гэты так і застаўся гнісці на высечках, бо лета было дажджлівае. Дзякуй богу, што гэты разбой прыпынілі. Мы

гаспадары, дык трэба ж быць гаспадарамі, чорт пабяры!

І потым, хто ведае, як дзейнічае на псіхіку чалавека выгляд кар'ера на месцы зялёных узгоркаў, звалкі на месцы поплаву, бурай роўнядзі торфанарыхтоўчай гаспадаркі на месцы мокрай лугавіны? Быццам невядома, што Палессе не толькі каласальны рэзервуар, з якога нараджаюцца аблокі і дажджы для навакольных земляў, але і пясок, дзюны, якія прыніклі пад тонкім слоем дзірвану і зялёнай футрай лясоў, толькі і чакаюць іх знішчэння, каб тыграмі вырвацца на волю.

Мы пакуль што не можам з упэўненасцю меркаваць, карысны ці шкодны той ці іншы від жывёл ці раслін для жыцця ўвогуле, для вялізнай гармоніі біясферы на зямлі. І мы робім гэта. Мы ведаем ганебна мала — і мы робім выгляд, што ведаем усё. Таму, што мы жывём у доўг, пазычаючы й пазычаючы ў банку, запасы якога нявечныя, як і ўсё на зямлі.

У Палескі скарб валяецца ў нас пад нагамі, а нам неахвота нагнуцца і падняць яго. Дзесяткі тысяч людзей, замест Балатона ці Залатых пяскоў, праехаліся б на параходзе на ціхай яшчэ Прыпяці, пазагаралі б, палавілі рыбу, пакачаліся б на цвітучых яе паплавах. І пакінулі б тут грошы, якіх хапіла б на тое, каб аднавідь старыя будынкі, узбагаціць музеі і ператварыць усё гэта зноў у грошы, коштам якіх можна было зрабіць Палессе, — дый не толькі яго, — Эдэмам.

Дзесяткі турысцкіх паходаў ажывілі б Дняпро, і Прыпяць, і Сож. А між тым рачны флот беларускі памірае. Знізу яго падціскае кіеўская флатылія, і мы задавальняемся — і то не наша тут паслуга — толькі перагрузкай руды з іхніх вялікіх рудавозаў на свае, меншыя.

Жоўць руплівага гаспадара разліваецца ўва мне, калі бачу безгаспадарчасць. Я сню Прыпяць з белымі параходамі Брэст — Гомель, з матэлямі і кэмпінгамі ў гушчары лесу, Прыпяць цвітучую, Прыпяць высакародную і чыстую, па берагах якой паўсюль можна прабегчы босым, не парэзаўшы пятаў. Прыпяць, на якой працуюць заводы рыбагадоўлі і адноўлены чароды дняпроўскай сцерлядзі і асятра. Прыпяць, на якой нешта прыдумалі, каб "Ракеты" не забівалі рыбу (я сам бачыў пудовых шчупакоў, прыбітых да берага). Я сню Прыпяць багацейшай ракою. І я сню яе — у галоўным — такой, як зараз, з пышнымі дубовымі гаямі над вусцем Случы, са смолкамі-смалянкамі на сытых паплавах, з дробнымі ліловымі званочкамі-"цыганамі", — нібы мільёны табараў сышліся на адным лузе.

…Я сню яе прыўкраснай.

Перад упадзеннем у Прыпяць Гарыні пацягнуўся дагістарычны лес. Каравыя вербы з дзвюма-трыма буслянкамі,

перакручаныя, як душы змарлых у пекле вялікага тасканца. І маленькія маладыя вербы, што толькі падкрэслівалі трагічнасць пейзажу. А над усім гэтым, над буслінымі крыламі, першабытнае неба, нібы ў час стварэння сусвету.

Бусел за буслам зрываўся з дрэў па меры набліжэння парахода. Было гэта буслінае каралеўства.

Я ведаў, што недзе жыве і пануе над ім кароль-бусел з крыламі, размахам на палову неба. Ногі да каленяў улезлі ў твань, бо праваліўся за стагоддзі. Стаіць у зарасцях тысячагадовых беларускіх дубоў. Іхнія вяршыні ледзь прыкрываюць яму загорбак, бо галава ў яго прыціснутая, а дзюба лягла на грудзі.

Думае. Птушкі баяцца парушаць ягоны пакой. Калі ж набярэцца бясчынстваў, браканьерства, выгаляння над жывым — уздыме галаву, пракінецца і махам крылаў уздыме ўраган і змяце тых, што рабілі такое з яго братамі і гвалцілі натуру ды крыўдзілі меншых братоў.

А пакіне толькі гэтых, хто працаваў заўзята і ўпарта, думаў глыбока і добра, чыніў справядлівасць і ніколі не крыўдзіў ні жывёл, ні дрэваў, ні раслін, ні іншых людзей. І яшчэ не крыўдзіў яго рахманы, спакойны і мудры бусліны народ.

IX. Пагарынская Венецыя

Гадзін у шэсць вечара — сонца было яшчэ куды як высока — увайшлі ў Гарынь. Пасля цёмнай, празрыстай прыпяцкай вады тут вада была каламутная, непразрыстая, імклівая. Рэчка вілася так, нібы за ёю гнаўся казачны цмок, і шырока ляжалі вакол голыя паплавы з чародамі рабых і вогненных кароў.

Праплылі паўз нейкую каробку з пустымі праваламі вокнаў.

— Завод кансерваў, - сказаў капітан.

— А чаго то ён пусты такі?

— Закансервавалі, - змрочна сказаў капітан.

Весці яму параходзік тут было цяжкавата. Не разгорнешся. Толькі выйшаў на прамую — мяняй курс. Але ўсякай непрыемнасці бывае канец. З-за купаў дрэў выплылі першыя, старанна прыхаваныя хаткі, вербы над вадою, сотні чаўноў, прывязаныя да іх. І платы, што стаялі ўпрытык да вады, аксамітна-зялёныя знізу ад вільгаці.

Венецыя на зары свайго існавання, калі першыя беглыя рыбакі высадзіліся на востраў Маламока, была, відаць, менавіта гэткай: дымка над вадой, зелень платоў і дрэў, чаўны з задзёртымі насамі. І ціша.

Вечарам мы крыху пасядзелі з нашымі хлопцамі. Шкада было развітацца з імі: народам вясёлым, грубаватым і дасціпным. Харошыя хлопцы! Пра кожнага можна было б напісаць апавяданне. Калісьці я так і зраблю, паплаваўшы з імі не тыдзень а, скажам, месяц.

А цяпер проста дзякуй ім ад усіх нас.

Спакавалі рукзакі. Зянон узлез на сваю паліцу, звесіўшы з яе ногі: ні даць ні ўзяць — макароны на лыжцы. Хутка засоп і Валянцін. А я ляжаў і ўспамінаў, што я ведаю пра гарадок і яго наваколле. Ведаў я ганебна мала. Мы ўвогуле ганебна мала ведаем сваю радзіму, і нам даўно патрэбен свой краязнаўчы часопіс. "Наш край".

Ведаў тое, што размешчаны Давыд-Гарадок на астравах Гарыні, праўдзівей, між яе рэчышчам і старыкамі, што да рэвалюцыі жыхары разводзілі садавіну, а цяпер — кветкі, і мястэчка славіцца імі ледзь не па самы Урал, што народ тут увогуле прадпрымальны і тутэйшыя паляндвіцы ды шынкі куплялі нават у Варшаве. Ведаў, што тут шмат ганчароў, а калісьці былі майстры па вырабе рачных суднаў і што мясцовая царква адна з самых старых драўляных цэркваў на Палессі.

А што са старадаўняга? Ну, тое, што калісь на Гарыні было

шмат гарадоў (цяпер хіба толькі Давыд-Гарадок ды Столін), былі яны багатыя і гандлёвыя, але выпальваліся, пачынаючы з XI стагоддзя, ледзь не па тры разы на кожныя сто год. Ушчэнт.

Пабудаваны Давідам, князем Тураўскім, на зары хрысціянства, у паходах на крыжакаў гарадок славіўся невымернай смеласцю і ўмельствам воінаў. Бараніўся і ад татар, і ад кепскай памяці князя Валконскага ў 1665 годзе, прычым быў знішчаны да попелу і тлену.

…На досвітку мы ўзвалілі рэчы на плечы, узялі лахі пад пахі і спусціліся па трапе на глеісты бераг. Горад ледзь прачынаўся ў тумане. "Маякоўскі" даў гудка ў наш гонар і адваліў. Мы стаялі і рабілі рукамі "аці" яму наўздагон. З палубы нам адказвалі тым самым.

Пасля параход знік. Мы засталіся адны пад схіламі вялізных валоў замчышча. Не меншых, чым у Оршы, Рагачове, Быхаве. Крэпасць была на свой час вялізнай.

Варушылася на адхонах трава, а над ёй панаваў вэлюм туману. І ціша. Глыбокая ціша стагоддзяў. Не было ёй канца.

Хаты маўчалі пад вязамі, клёнамі і ліпамі. І старыя, тыпова палескія, і новыя, звычайныя. Але ва ўсіх на франтонах было сонца з раскінутымі прамянямі, падобнае на рамонак.

Хаты стаялі пад знакам сонца. А вакол іх хісталіся густазялёныя каноплі. І цвіло ці збіралася зацвітаць (вясна была позняя) такое мора кветак, якога я не бачыў у жыцці. Півоні ўсіх колераў, ружы, аксамітна-стракатыя браткі, мацыёла, флоксы, зарасці вяргінь, канаў, пахучага гарошку, пантофелькаў маці божай і залатога бэрла. Віліся кручаныя панічы, грамафончыкі, дзікі вінаград, плюшч. Гарадок патанаў у моры кветак. Хаты задыхаліся ад водару, як рымляне на оргіі ў Нерона. Ільсняна чарнела спрыснутая дажджом зямля. Паўсюль, на кожным вольным лапіку, былі кветкі, кветкі, кветкі. Кветкі над платамі, кветкі над суцэльнымі радамі чаўноў у рэчцы і вясенніх каналах. Пагарынская Венецыя шалела, буйствавала ў іх разліве, таму й не хацелася нам адсюль ісці ні ў якія Альшаны і Аздамічы, дзе і дагэтуль трывала жывуць старыя звычаі і вопратка.

X. Вярхоўны цыганскі суддзя

У чайной сядзелі звычайныя палешукі. Бабулі з "крэндзелем" на галаве і ў белых фартухах паўзверх вышываных сукняў, вусатыя меднатварыя дзядзькі. Але ўся гэтая публіка, што ела смажаную гаўяду, сёрбала капусту, піла з асалодаю піва, а сямтам і прапускала па чарчыне, была яшчэ больш стракатая, бо сямтам сядзелі за сталамі цыганы ў сваіх вясёлкавых хвандаватых сукенках, шнуроўках, намістах, у сваіх камізэльках, ботах і шырокіх портках. І ля кожнай такой пары па некалькі дзяцей. За суседнім сталом аж чатыры снапкі лапаюць рукамі смажаніну з бульбан. І адразу чамусьці ўспомнілася, як змей пасябраваў з цыганом і цыган запрасіў яго вячэраць і вось з шатра выбегла штук дзесяць такіх мурзаў і радасна закрычала:

— Тата прыехаў! Змея на вячэру прывёз!

Калі верыць гэтай беларускай казцы, змей так кінуўся лататы, — аж дарога да самой Курылаўшчыны закурэла.

На вуліцы дзеці абляпілі нас, як камары-таўкуны.

— Дзядзька, паздымай! Дзядзька, паздымай!

Мы паздымалі. Відовішча было каларытнае. І адразу:

— А кеды картачкі?! А кеды картачкі?!

І дзіўна было чуць у вуснах цыганскіх людзей (адзін тыповы, а другі — беленькі гарбузік, зусім як беларус) знаёмы палескі дыялект.

Мілыя палескія цёткі заглядзеліся на Валянціна:

— І вы таксама цыган?

— Што вы, — сказаў я і паказаў на другога чарнявага, на Зянона, — гэта ён цыган.

— І гэты падобны, — сказалі цёткі.

"Цыганы" з апаратамі пашыбавалі здымаць старажытную царкву.

Толькі тут ад цікаўных спадарожніц-цётак. мы даведаліся, чаму на вулках такое цыганскае разнатраўе. Спраўлялі гадавую па вярхоўным цыганскім суддзі, пахаваным на давід-гарадоцкіх могілках. Адзін цыган пазычыў у другога грошы. Суддзя прыехаў разбіраць справу і ўтапіўся ў рачулцы ля вёскі Рамель. Утапіўся, ратуючы беларускую дзяўчыну-падлетка.

— Аркестра будзе. Сабралыся з усёй чыста зямлі.

Гэта мы пасля ўбачылі і самі. Вучоныя, рабочыя з МАЗа, аседлыя на зямлі і проста пералётныя птушкі. Вопраткі ад самых сучасных да ледзь не сярэдневяковых.

І аркестр убачылі. У шалёным намёце сцяліўся насустрач нам

конь, а на возе ззялі проста нам у вочы наяранымі меднымі глоткамі трубы. Тут мы, у прыватнасці Валянцін, зрабілі першую накладку: не паспелі сфатаграфаваць, такой каметай яны імчалі.

На месцы Валянціна я дзёр бы на сабе валасы.

А цёткі ўсё яшчэ прасвячалі нас:

— Бацюшко-о дазволіў ім на могілках трызну правіць. Воны світло хацелі туды правесці. Адных курэй дзвесце штук насмажылі, трох кабаноў купілі, бараноў. Па гарэлку паехалі ды піва.

Думаючы, якім чынам нам паздымаць гэта, каб хаця, крый бог, не натаўклі карак, мы прыйшлі да царквы на старых могілках. Яшчэ дагэтуль дзядзька з пявучым палескім акцэнтам растлумачыў мне, што гэта Юроўская царква, царква нябожчыкаў. А сам я ўбачыў, што ёй не менш як дзвесце год. Трохзрубная, з трыма шатрамі даху, уся ў зарасцях бэзу і вішняку, была яна — дзіва. Пчолы ў калодах бралі мёд з могільных дзічак і ліпаў, а наводдаль сціпла стаяла старажытная квадратная беларуская званіца.

Каравыя векавыя сосны, каменныя крыжы з паўмесяцам і шасцікутнай зоркай ураслі ў зямлю. У некаторых адваліліся верхнія лопасці. Нібы нехта замшэлы распасцёр рукі. А на распяццях асірыйскія, вавілонскія, бог ведае якія аблічы.

Музыка прымусіла нас кінуць агляд. Звычайныя пахавальныя маршы. Паўздоўж агароджы ішло на новыя могілкі шэсце цыганоў. Дарэмна мы саромеліся. Да нас проста падышлі і папрасілі зняць. І вось мы рассыпаліся, хто па дрэвах, хто на платы.

Наперадзе картэжу — цыган з барадой патрыярха нёс абраз у белым ручніку. За ім ішлі мужчыны, і натоўп іхні быў густа перасыпаны то старымі і змаршчакаватымі, то маладымі, неапісальна прыгожымі цыганкамі. Намісты, хвалі хвалістых сукенак. Завушніцы дрыжаць пад смалянымі хвалямі валасоў. Усё хвалістае, усё яркае, як крыху прыглушаны попелам жар. Кульгавая цыганка цягне нагу ў баку ад картэжу. Нясуць дзяцей. На руках і загорнутых у хусты.

Мора медзі, мора чырвані і сіні. А над усім гэтым — мора сонца. І не верыцца ў смерць, у тое, што ўсё мае пачатак і канец.

Такое крыклівае буянства ашалелых фарбаў мне даводзілася бачыць толькі ў першых каляровых фільмах. У "Салаўі-салоўцы", у "Сарочынскім кірмашы". Нібы ашалелы ландрын.

Ззаду ступае гладкі, як змей, гнеды конь. Вядзе яго здаравенны цыган. Збруя зіхаціць бляскам. На возе тыя, хто не можа хадзіць: паралізаваны стары і сівая цыганка з двума дзеткамі.

— З канём сфатаграфуй. Яго конь. Калі ласка, з канём…

Але вось мора ўлілося ў гусцюшчую зялёную засень могілак і паблякла.

У баку ад магілы на ўзнесеных латах два даўжэзныя вялізныя шатры з грубай мешкавіны. У адным посуд, мыцельнік, кухня, дзесяткі два баб гатуюць талеркі. У другім — доўгі рад сталоў з закуссю і выпіўкай.

Ля магілы галосяць. Спявае хор. Рухаецца чорна-зялёны епітрахіль папа. Сіні, матавы, як ягады ядлоўцу, цягнецца ў праменнях сонца дым ад кадзільніц. І надпіс:

"Базылевіч
Гарасім Ігнатавіч
1928–1968"

Рататаваў беларускую дзяўчынку. Ёй было пятнаццаць. Яму пад сорак.

Якія гордыя, медныя, часам ледзь не індзейскія твары! Вунь хаця б у той, з прамымі вугальна-чорнымі валасамі, што падаюць на плечы, з гарбаносым, крыху шыракаватым абліччам. Або тая маладая зусім і ўжо цывілізаваная крыху. Рухомы твар, пластычныя рухі, белая кісейная кофта і стракатая сукенка. Павярнулася — ну, хоць адразу на сцэну, такая бездань гонару і плаўнасці. Аседлая. Жыве ў вёсцы Хорск. І прозвішча, як ва ўсіх тутэйшых цыганоў, беларускае: Вішнеўская.

Эх, так і пацягнула мяне да іх! Магчыма, мая цыганская кроў.

— А ото цыганскія фатографы.

Гэта на Валянціна і Зянона.

— Бач, і фатографаў сваіх з сабой прывезлы.

"Цыганскія фатографы" збянтэжаны ўкрай, але лазяць паўсюль, ловяць ракурсы, здымаюць. І ёсць што здымаць. І ўсё гэта прыгожа, тэатральна, пластычна ў кожнай "мізансцэне", як балет. І так этнаграфічна, так нязвыкла, і столькі ва ўсіх гэтых звычаях гонару і павагі да традыцый. Трымаюцца іх. І добра, што трымаюцца.

Як бы ні жыў цыган, у якой бы хаце або нават кватэры ні жыў, а праводзяць яго ў краіну Цыганію пад шатром. Пад шатром і пад зорамі або пад дажджом. У далёкі шлях, па якім вечна рыпець колам і вечна ступаць капытам цыганскага каня.

І гэта ў крыві. Вось малая цыганачка штурхае каляску з ледзь меншым за сябе дзіцем. Цяжка на байраках, людзі стаяць на дарозе. І вось раптам яна гартанна, са страсцю тысяч пакаленняў крычыць:

— Чавэло!!!

Ах, гэты разліў, шырокі, нібы ўся нямераная цыганская зямля! Гэты змрочны і маўклівы першы кубак. Не трэба нам тут больш. Знікнем паціхеньку і пакінем іх з горам і з думамі аб апошняй цыганскай дарозе. Вязі, косю, вязі! Свяці яму на ёй начное, цыганскае сонца.

XI. Што такое "бусько"

Што за гарадок! Замест бульбы ў гародах кілім кветак. Механік "Сельгастэхнікі" Максім Рабкоў зрабіў сабе човен-амфібію. Праехаў горадам, плюхнуўся з берага ў ваду дый паплыў на рыбалку. Яшчэ адзін выдумаў для працы на гародзе мікратрактар на трох колах. Чатыры чалавекі можа везці. Сена на ім возіць. Палескія дзеткі на вуліцах паказваюць на нас пальцамі.

— Фоткі павялічваюць.

Палічылі, значыцца, за халтуршчыкаў, бадзячых барыг і бізнесменаў, што тайком ад райфа ходзяць па вёсках і зашыбаюць рублі.

Пад вечар дамовіўся са старшынёй гарсавета і са свяшчэннікам, каб дазволілі зняць інтэр'ер царквы. Дазволілі. Толькі самага каштоўнага, царскай брамы, ужо няма. Знялі і адправілі. Здаецца, у Пінскі музей.

Галава злёгку адурэла ад чалавечага тлуму і гарачыні. А тут яшчэ лётаюць на матацыклах дзяўчаты ў чырвоных і апельсінавых сукенках. А тут яшчэ танцуюць, скачуць пад нагамі цыганяты, просяць у Валянціна:

— Дай, дай, дзядзька, капеечку! Дай, каб ты даехаў да дому! Каб ты сто год пражыў!

Валянцін нешта не дужа хоча жыць да ста гадоў і не хоча даехаць да дому.

Вечарам крыху адпачываем на могілках. Юроўская званіца ў спакойным вячэрнім сонцы ўся аранжавая. І такая ва ўсім гэтым дасканаласць, такі асуджаны спакой адыходзячай старой Беларусі. А ў траве настойлівае: "Фр'ю! Фр'ю! Фр'ю!"

Палескія цыкадкі. Так, на Палессі водзяцца цыкады.

Крыж у мой рост ляжаў ніцма. Каменны. Я з цяжкасцю ўзняў яго і паставіў. Зірнула аблічча. Перакошанае, страшнае аблічча, як у паганскага ідала, вызваленага з зямлі. Грымаса болю, велізарныя, пляскатыя, як ступакі, рыдлёўкі рук. Грудзі звісаюць на тры скупа намечаныя складкі жывата. Тры складкі. Паўкружжам. І ва ўсім гэтым умоўнасць і вышэйшая адначасова рэальнасць.

Ішлі дамоў. На страсе стаяў чырвоны бусел і ляскаў дзюбай. Маленькая дзяўчынка выняла палец з рота і паказала на яго, даверліва ўсміхнуўшыся:

— Гэта бусько, — сказала яна.

XII. Мір вам!

Раніцаю, пасля беганіны, ледзь датаўкліся з дапамогаю сакратара гарсавета Валі ў царкву. Пуста. Пазней даведаўся, што дзеці з урвісаў лазяць сюды гуляць у карты. Гэта б яшчэ нічога, але шыльду аб ахове помніка архітэктуры нейкія два, што прыехалі на "газіку" (і нумар запісаць не паспелі), недзе ў маі паддзелі крыжам, спаролі і павезлі. Пасля мне, праўда, сказалі, што шыльда ўсё адно была напісана "не па правілах" і што яе трэ было замяніць новай. Ну то й замяняйце. Толькі я ў непаразуменні, якія такія "правілы" для такіх шыльдаў. І, галоўнае, тая ж самая карціна ў Пінску, Ружанах, у сотні мясцін. Зняў — і ніякага табе клопату. Як быццам справа ў шыльдзе, а не ў справе.

Што можна ўбачыць у той царкве? Хоры з прымітыўным, дужа беларускім "Маленнем аб чашы"? Па сценах абразы з псеўдараманскімі — фініфць з золатам, як на сурвэтачных колцах пачатку стагоддзя, — акладамі. Цікавае ў іх толькі тое, што гэта ахвяры старых давід-гарадоцкіх цэхаў. Скажам, цэх цесляў ахвяраваў "Нараджэнне" (і цалкам лагічна. Іосіф таксама быў цесля). Або цэх краўцоў ахвяраваў "Пакровы" (і гэта са значэннем, бо пакроў трэба было камусьці шыць). У гэтым мілы наіў.

Абразы на сценах — часткова пэцканіна. Але галава святога Юрыя (не тулава) і "Прынясенне ў храм" з мілым велікавокім абліччам Марыі і строгім тварам Сімяона, на якім важлівасць моманту і адчуванне, што сплываюць апошнія хвіліны, што цяпер можна і памерці, - гэта дабротная работа, якой пад сто год. Калі гэта і не Васняцоў, то нехта з лепшых яго вучняў. Ва ўсякім разе, не горш, а можа, і лепш за яго тварэнні ў Валадзімірскім саборы Кіева.

Але гэта — не галоўнае. Галоўнае іканастас. Верх ягоны — XVIII стагоддзе, цяжкаваты, мясцовы жывапіс з фарбамі злёгку пажухлымі, але затое па-беларуску грунтоўнымі. А ў ім дзве рэчы XVII, ну, можа, самага пачатку XVIII стагоддзя. Маці божая і Спас. Адвечная жаноцкасць маці і адвечная туга за людзей. Гэта здорава! На жаль, аклад скрывае ўсё, акрамя абліччаў і тонкіх, любоўных рук, і разгледзець гэта больш дакладна не ўдаецца.

Але ўсё адно гэтыя твары, гэтыя рукі, гэтую вялікую цішыню і вялікі спакой закінутага будынка, гэтую драму і пыльнае сонца — немагчыма забыць.

Крыху ашалелыя, мы ішлі вулкамі, паплаўцамі, садамі, і мне хацелася сказаць — мір усяму…

Ходзяць берагам старыка белыя пеўні, пушаць таполі. Мір вам!

І, аднак, ішла бяда.

У Карпатах дажджы. З Сарнаў пазванілі: вада ўзнялася раптоўна больш чым на паўтара метра і пагражае ўзняцца вышэй. Калі не здарыцца дзіва — заўтра ці паслязаўтра тут залье дарогі, і нельга будзе трапіць нават у Рубель. Залье нізкія бульбянікі, гароды, кветнікі, што толькі пачалі цвісці. Залье паплавы, і сена не будзе. Перад самым янавым днём. Няўжо зноў пагроза гэтаму дабрабыту?!

Мы вырашылі выбірацца хутчэй. Сустрэлі дзяўчат з вёскі Альшаны і пачалі распытваць: куды, як, нашто.

І ясна стала, што не дабяромся мы ўжо ні да Аздамічаў, ні да Сямігосцічаў, ні да Верасніцы. Ды мы й самі бачылі, што аўтобусы не ходзяць, а ісці 25 кіламетраў з чыгуннай цяжкой апаратурай і рэчамі немагчыма. Даводзілася толькі чакаць.

Дзве Галі з Альшан толькі ўздыхнулі:

— Пажар можна ўтушыць, воду ўтушыць няможно.

Разгаварыліся. Доўга не хацелі гаварыць імёны, але адрас альшанскага дзядзькі, што пускае начаваць, далі. Урэшце пачалося:

— Вы хто?

— Томы, Валі, Марусі… На Беларусі ўсе Марусі.

Хлопцы ўпалі ў задор і ўрэшце даведаліся: Галі.

— Дык што гэта ў вас усе — Галі?

— Угм…

— А вы, Галі замужам ці не?

— Замуж так скора выходзіць не трэба. Дзяцей народзіш, як цыганы.

— За аднакласнікаў не пойдзеш. А старэйшыя ў арміі. Пета, Коля, Ілля — усе мы трое друззя. А вы што робітэ?

— Касцюмы шукаем, дзяўчаты.

— От у нас хор быў у старых касцюмах. Картачка ёсць, як сестра была.

— Тэпэр не носім.

— Чаго так, дзяўчаты?

— А… як фараон ходзіш. Спадніцы, анучы. Летам парышся.

— Катора худзенька, пад бокі накладае.

— Хто ж гэта вас такому глупству навучыў?

— Настаўнікі ў нас з Мінска ды з Пінска самі пасмейваліся. Дужэ смяяліся з народных касцюмаў.

Але ж і настаўнікі! Без году тыдзень, як табліцу множання вывучаў, а насміхаецца з густу народа, з яго таленту. А ў дзяўчат у голасе ўсё яшчэ адценне нібыта суму.

— І хусткі яркія былі. "Амерыканкі", "шаляноўкі". Вам у Цярэблічы трэба дабірацца. Там яшчэ ўсё па-старому. Карсэткі. Шоўкавай сукенкі не знойдзеш, усё палаценка.

— То мы заўтра вас у народных касцюмах здымем. Дзе жывяце?

Абмовілася, нібыта незнарок:

- Іван Баклан мой сусед.

— Глядзіце, на слове спаймалі.

Вечар. Здымаем кветкі. Цяжкія снежныя шары півоняў, духмяныя стрэлы лубіну, ахапкі касачоў і лілей, празрыста-зялёныя аблокі гарошку. І ўсё гэта пад вялізнымі грушамі. А вокны хатак, складзены з брусоў, рахмана глядзяць праз кветкі і лістоту. Смерць, спыні сваю касу! Спыніся, сціхні, Гарынь!

XIII. Нараджэнне песні. Нараджэнне жыцця

У Альшанах, з іхнім вялізарным клубам, з рукавом Гарыні (на шчасце, вада пакуль не спяшалася падымацца), з дзесяткамі трыма новых будынкаў і стогадовай драўлянай царквой на цяністым цвінтары, мы перш за ўсё пайшлі шукаць Івана Баклана. Няма нікога. Побач з цудоўнай кнігарняй (мне асабліва спадабалася, што кнігагандаль заслаў туды пяць экземпляраў другога тома майго рамана і ніводнага першага тома — растаропнасць і ўменне гандляваць проста вышэй за ўсякую крытыку), — побач з гэтым магазінам убачылі хату пасярэдзіне вуліцы. Таямніцы планіроўкі. Гарод — цераз вуліцу. У ім, у нетрах канопляў, бабуля. Вочы ясныя. Твар сухі, загарэлы.

— Гарод у вас, бабця, — шкелца.

— Гарод, таварышы начальнікі, харошы.

— Ну, якія мы начальнікі?!

— Но, тады сынкі… А гарод харошы. Каноплі дзяржаве здаём. І плацяць някепска. Але ж працы…

— А дзе ж гэта Іван Баклан?

— Баклан? А хай яго качкі, хай яго.

— А што?

— Ды курэй многа паразвёў. Курэй дзяржыць многа. Спасу няма… А вы кіньце валізы ў яго на двары.

— А як жа: у яго з хаты вокан у двор няма?

— А ў нас, сынкі, не было шчэ такога, каб чужога баяцца. Кідайце. Прыйдзе, убачыць і забярэ ў хату.

Бабуся казачная. І вось мы ўрэшце і спадобіліся пасля "цыганскіх фатографаў" і "начальнікаў" простага слова "сынкі".

Кінулі рэчы, пайшлі на ганак праўлення. Пакурвалі з дзядзькамі. Размова ішла крыху насцярожаная. Пагаварылі аб повені. Як быццам хадзілі чуткі, што ўверх па рацэ жыхары скінуліся, нанялі бульдозер, і той у самым нізкім месцы берага, адкуль вада магла рынуць на паплавы і сады, змываючы ўсё, наваліў ім нізенькую дамбу. Пакуль што рака не перахваснула яе. Але як дождж будзе яшчэ, як повень яшчэ ўспыхне — тады зноў хаты, сады й кветнікі будуць у вадзе. Летняя паводка. Страшны біч! І як тады зацугляеш раку?

Раптам нехта сказаў радасна:

— А от і яшчэ адзін гарадскі. Два. Ну, гэто хіба японці.

Набліжаліся два чалавекі. На адным быў казырок ад сонца, і

здалёк здавалася, што ён сапраўды нацягнуў на галаву японскі ваенны кашкет.

— Вашы?

— Не.

І ў тую ж хвіліну я пазнаў іх. Куды ні заносяць чэрці нашага брата! Топалі з магнітафонам два фальклярысты з акадэміі — Міша і Арсень. У экспедыцыю іх, сардэчных, прынесла. І собіла ж — у самую глушыню! Ды яшчэ каб мы тут былі. Здзівіліся, вядома.

А пасля тыя, без доўгіх слоў, селі на прыступкі і пусцілі магнітафон: самы, як выявілася, верны метад, самы лепшы ключ да душы. Што тут пачалося! З другога канца вулкі, ад чайной, ад клуба, проста з двароў, ірванулі сюды мужыкі. Па прынцыпе зявак усёй Беларусі: "Хай пасля людзі не кажуць, што я ззаду бег".

Прыбеглі. Расселіся. Якія ж сталі твары, якім мяккім святлом загарэліся вочы! Сваё. І не толькі ў бяседзе, а і ў "машыне". У той момант я раскрышыў бы ўсе нашы магазіны грампласцінак. Песня. Другая. Змоўклі.

— Мы калісьці над рэчкаю спявалі. За шэсць вёрст чутна было.

— У чайной не заспяваеш. Вось выедзем давайце на Канаву (гэта старык), будзем у лодках спяваць.

— От, каб даяркі запелі!

Мы так і зрабілі. Пайшлі спачатку ў садова-гародную брыгаду, у плямісты ад сонца, густа-цяністы сад, а пасля паехалі з даяркамі на пасавіска.

Спявалі дарогаю, трымаючыся ў кузаве адзін за аднаго. Спявалі і потым, ля закансерваванага завода, ля загонаў з ільдзістымі брыламі лізунца. Гарачае сонца драбілася ў іх.

Мы ледзь паспявалі ўпраўляцца. Арсень з магнітафонам, Міша з алоўкам, мы з апаратамі, а я яшчэ й з блакнотам.

Галіна Леўчанка спявала, святочна накінуўшы на галаву ліловую газавую хусцінку. А побач хісталася ў такт ёй белая ў кветкі хустка Насты Сысы. Усмешлівая, вастраносенькая, рот, як месячык, вочы смяюцца. І ўжо зусім прыемна было побач з імі бачыць злёгку надзьмутыя губкі ды шырокія чорныя бровы Дуні Скрабейкі. Усе галасістыя, загарэлыя, як негры. Спявалі "Хадзіла сіротка":

Як мы любіліса,
То сухія сады цвілы,
Як мы перасталі,
То й зялёныя сів'ялы.

Як слухалі ўсе! Пастух, што толькі прыгнаў каровы, пастух з суровым абліччам слухаў, успершыся грудзьмі на кій, прыкрыўшы вочы.

Міхась Клочка прыяднаўся, уплёў голас, душэўны і густы:

Плакала, рыдала,
Лічко пабеліло,
Наверно дзеўчына
Веночок жалела.
Веночок жалела,
Усе тайныя рэчы,
Касу распусціла
На ўсе свае плечы.

Наталля Сыса ўступіла за імі, старэйшая крыху за іх. Адразу гожым зрабілася добрае мілае аблічча, задрыжэлі завушніцы-паўмесяцы ў добрай формы вушах:

Ой, жалю мой, жалю,
Вялікі пячалю.

Яшчэ мужык не вытрымаў. Вастраносік-верабей. І хахалок з-пад кепкі. Іван Шут:

Ой ты, гара, гара,
Гара высокая,
Што й на тобі, гара,
Чотыры сокала.

Кожны голас — скарб! Няма кепскіх, каб яны здаровыя былі. Кожны не з горла цісне, а душой спявае. Як мяняецца чалавек, калі спявае! Колькі ў ім адразу вышняй прыгажосці!

Я памагаў карміць цялят, гладзенькіх, як барокавыя анёлкі, і з такімі самымі нявіннымі слівавымі вачыма. Адзін хацеў есці і таму смактаў вуха ў другога. У гэты момант крык пастухоў: карова раджае. Адразу ж грубаватыя мужчынскія галасы:

— На песню лезе.

— От, як спявалі! Ну, салавейкі!

І здаровы рогат.

Гэтыя салавейкі, аднак, цягалі на памост, на вышыню ў тры метры, бітоны літраў на сорак, каб зліваць малако ў малакавоз. Нікому не прыйшло ў галаву, што патрэбна і тут механізацыя.

Зноў слухалі магнітафон і раскокалі здаровы слоік з малаком, узлезшы на лавы і агароджу. Зноў выбух маладога беспрычыннага смеху.

— Шолопуты!

— Усцерабіліса і на лаўкы і на слоікі.

Хапае і на смех, і на песні.

Мылі вёдры ў рацэ і зноў спявалі. Тураваў ім з-за Гарыні каровін рык. Карова-парадзіха лізала цяля па вушах, вачах, мордзе і задаволена мычэла. А цялічка, усяго дзесяці хвілін жыцця, аранжавая, з белай мордай і чырвонымі акулярамі, усё мкнулася ўстаць насустрач гэтым аблокам, сіняму сонцу, мяккаму павеву з ракі.

— Ну, а ты чого ляжыш? Уставай.

Тая ўрэшце ўстала на хісткіх нагах, якія дрыжэлі ўсё менш і менш.

Арсень і я сядзелі на беразе і думалі і гаварылі пра адно. На кожным кроку, нават сярод гэтых, утрапёных, усё часцей і часцей сустрэнеш тое, што яны не любяць сваёй песні або робяць такі выгляд, бо саромеюцца. Дый з кім спяваць? Хлопцы ў арміі, хлопцы ў горадзе. Песня ні з кім не вяжа агульным узбуджэннем, як было. І ўсё менш застаецца ёй абшару сярод родных лясоў.

Радыё і тэлебачанне нясуць песні-аднадзёнкі, міжволі выклікаючы ў людзей захапленне модай і сорам за сваю, "другарадную" песню, якая ціха засынае ў нетрах або патанае на дне азёр.

Трэба хаця б збіраць, выдаваць. Але існуе абавязковасць маршрутаў, калі трэба аб'ехаць пэўную колькасць вёсак, нават калі ведаеш, што ў суседняй вёсцы дзесяткі спевакоў, нават калі тут, у той, дзе ты зараз, можна ад аднаго чалавека запісаць семдзесят, а то і сто.

— Дав-вай маршрут!

І вось з-за нашай безуважлівасці цудоўная наша песня саступае месца нейкай "Ладзе", што, як трызненне, гналася за намі ўсё падарожжа, нейкай "Ладзе", крыклівай і нахабнай, як хам у Луўры, навязлівай, як свіння, што кладзе ногі на стол, песні, якую заўтра забудуць, але якая зрабіла частку сваёй справы, саступіўшы месца такому ж сабачаму трызненню, але на хвіліну адштурхнуўшы сапраўднае, песні апафеозу дрэннага густу, песні, якая не песня, якую, можа, й помніць будуць толькі таму, што пара дубовых галоў (і ў тым ліку я) мелі глупства памянуць яе нядобрым словам.

А непадалёк адсюль, у Фядорах, той жа Арсень запісаў такі жніўны дыямент:

Ой, я жала, не ляжала,
Тры снапочкі нажала.
А хто зо мною снапка звяжа,
Той зо мною спаткі ляжа.
Снапка звяжа цеснесенько,
Ляжа спаты шчыльнесенько.
Снапок звяжа — дай падыме,
Спаты ляжа — дай абдыме.
Снапок звяжа — памацуе,
Ляжа спаты — пацалуе.

Ехалі назад. Зноў быў смех. І ўсякія песні і байкі. А вакол цягнуліся хмызы, сухая трава і маленькія астраўкі палескіх дзюнаў, рабрыстых, як мыцельная дошка. Вырваліся, выпаўзлі, чакалі часу, пакуль адамруць песні і лясы.

Арсень раптам глуха ўспомніў, як збіраў з бабуляй зёлкі і як тая сказала:

— Вучыса старой песні. Памром. Ты будзеш яе спяваць, а мне ў зямлі лягчэй будзе.

XIV. Ціхі вечар

Праводзілі Арсеня і Мішу. Спакой разам з вечарам спускаўся на вёску. Усё мацней пачынала тхнуць ад дрэўных шатаў прахалодай, але вулічны пыл быў яшчэ гарачы. На дахах і званіцах ляжала сумнае цёплае святло.

Сядзелі з дзвюма мілымі бабулямі на лавачцы ды гаварылі, вячэрнім чынам, пра тое пра сёе.

Дзядзька ідзе з віламі. Вілы завуцца "быкі". Ад сонца бляха купалоў зазалацілася, заззяла чырвоным золатам. Вечар ясны. Сонца сядае чыста. Заўтра будзе добры сонечны дзень. Камары таўкуць. Будуць яшчэ тысячы сонечных дзён. Будзе сонца.

— Пакажу вам тую вярэньку, дэ хлебець насілы.

Вярэнька дзівосная. З тугой крышкай, плеценая з бяросты так, што не хлеб, а ваду насіць можна.

— З ёю ў школе прадстаўлялі. А калысь яшчэ вялікія для хліба былі. "Шаня" для хліба.

— Бяроста — яна здаровая была, — уступае другая. — Ногы не гніюць. Калысь людзі спакайней жылі. Ані клопату, то й займалыся.

— Са скуры постолы, то ўжо для свята, для храму.

— Но. Уроніш з нагі то — "Ой-ой, храмоў чаравік упаў".

— А як у вас кацатых звецца? Ну, падвірка для падплёту? Спіца? — пытаю я.

— Спіца. А як падплятае — падплітанка. А раменьчыкі сырамятныя — волокы.

— Волокы? — перапытваю незнарок я.

— Волокы, што рыбу ловяць. А тое наставэнь, — паказвае яна.

Паўз нас ідуць хлапчукі з таптухай. У торбе дробныя шчупакі і залаты нябуйны карась.

Кожнае слова дыямент! Як ласкава і родна слухаць яго, ведаць, што ёсць твой корань на гэтай зямлі, што ты свой тут.

Бабцы Фёкле Сысе 67 год, яна ўспамінае:

— Калысь, як ішлі замуж, то ў запоіны малады гасцінца дзеўцы: пляце харошыя пасталы. І танцавалі ў іх. Й як яшчэ прытупвалі.

— Цяпер людзі вучацца-вучацца, — кажа суседка, тая, што раніцай у каноплях працавала. — Цяпер, як зап'ецца, то й чаравік не купляе.

Заспявалі недзе за садам.

— Цяперашнія песні не докажуць колісных. Колісныя ўсе ў праўдзе.

— У нас Андрый быў. Пасвіў тавар. З-пад Турава. О, спяваў! Так маўклівы быў, а запяе — усё замрэ, — і спахапілася: — О-ой, сядзіць старая баба! А дзе ж мой онук дзіўся?

Ідзём шукаць "онука", знаходзім яго ў двары з вялікім малатком у руцэ і вядзём да бабы.

— Вось гавораць! — кажа Валянцін. — Не прыдумаеш. Пад Івянцом на паляванне ішлі па чарнатропу. Дык адзін кажа: "Ну, то сёння паляванне будзе. Следна".

Бабка ўсё яшчэ гладзіць варэньку:

— Памяць. Вікавына (гэта "векаўшчына")! У яе ж не нальецца вада.

Бярэ малаток:

— То як баба абсякала город, то колішнага мыкалаіўскага знайшла.

Яна досыць прыкметна какетнічае і тым, што яе слухаюць, і сваім уменнем гаварыць разважліва і разумна, і тым, што ладна кроіць сказ, знатна ўзважваючы і падбіраючы словы.

— Год сто трыццаць назад, было ў нас семдзесят надзілоў. Як бы дзяды паўсталы з могыл, то не пазналы б. Горад, Масква.

— Прарочылі, праўда, — не адстае суседка. — Вось пташкы з жалезнымі дзюбамі. Ерапланы. А раней?

— Дзе машына пройшла — слід нюхалы. А цяпер давялося бабе і й на "Пабедзе" праехаць. А вік наш нехарошы. Войны перажылы.

— Я за свой вік шэсць перажыла. Но жыць багацей. На рыштунку[1] ніхто не спіць.

— Песняў старых шкада, — і тут баба Фёкла проста аж здзіўляе і расчульвае мяне. — Ім "Лада-лада", г…, ой, прошу вас! Ну, школа іх вучыць гэтаму. Радзіво. "Ну, Тонежа-Тонежа". А як того, як жа заспявае, то ўсі бягуць, і старыя і маладыя. Усім цікава.

— Раней, як вяселле, то тры дні песнэ. Каравай ставяць — песнэ, рэжуць — песнэ. Тры дні спяваюць і ўсіх пераспяваць не могуць… Ой, заговорылася! Заговорылы вас.

Мілыя вы бабці! Куды там загаварылі. Век бы слухаў.

…Дарога па вячэрняй вёсцы. Стрэхі ў жыце. Росная, следная трава на вясковых могілках. Плеценыя платы. Вогненны, расплаўлены шафран заходу, і на ім, як цені, як ізваянні — буслы. Адзін дыбаў па вільчыку, нёс у дзюбе хлюдзінкі. Засаромеўся, угледзеўшы чужых, выпусціў і ўзляцеў. Гэты адцінак найлепшай, найбольш зацененай вуліцы ў Альшанах зваўся Шабунькі. Цяпер у яго назва: вуліца Северная. Таксама перайменаванне. Мала новых бяздумна паназываных вуліц розных там Радыятарных або Трэціх Лінейных…

Падыходзім да клуба. Дзіцёнак нейкі шчыра і з поўным даверам глядзіць на нас і паведамляе:

— А знаеце, хто ў бульбе? Каралацкія жукі.

І раптам з клуба, як праклён, як лямант, які абражае сваёю пачварнасцю гэты залаты вечар, на поўны моц дынаміка:

Хмурiться не над-а, Л-а-а-да,
Для меня твой смех нагр-а-ада.

І сюды дайшла гэтая пошасць.

…Вячэраем з гаспадаром і гаспадыняй. Сапраўды, убачыў рэчы і перацягнуў у хату. Летні паважны дзядзька. Есць дымную бульбу з кіслым малаком і філасофствуе, і адзіны гэта паратунак пасля клубнага, як кот на страсе, няўкання і выцця.

Размова, як заўсёды сярод мужыкоў, ідзе пра палітыку, ад Пятра Першага аж да Гітлера.

— Слоўцы твае добрыя, ды работа чортава. І хаця б разложыстыя вусы былі, а то… яціт тваю пад носам. Беларусаў паўсюль прасвешчалі. У нямецкіх і іншых усякіх гарадах. Мяне вось у Быдгашчы. На нашу Беларусь, як на красыву дзеўку, усе кыдаюцца. Усього многа. Нам бы парадак. Ну, ясна, як Івана не ў морду, то ў розум не вб'е. Адно дрэнна. Так хлопец у андарак пайшоў, а так — у салдаты. Усе хлопцы ў некруткі. А дзіўкы сваю войну. Дзесяць на аднаго.

І праўда, на які д'ябал вайна, ды яшчэ ў дадатак да кепскай эстрады. Знікнуць дрэвы, і гэтыя людзі, і мова. А калі ты, такое, знікнеш з зямлі, то знікне ўсё святое на ёй.

— Ёсць у нас, ясна, і лапцявая пошта. У трыццаць дзевятым начальнік польскі бачыць, што бабы ля студне сокочуць. "Што такое?" — "Вайна!2 — "Я не чуў". Аж назаўтра, спраўжды, вайна. Но гэто нам нічого. Розуму ў нас хапала, каб і цёмнымі разумнага абдурыць. Мой дзід непісьменны быў. Усё на карбусі адмячаў. Так засечка — Івану аддаў, гэтак — Сцяпану. А разумны быў, дай бог нам з вамы. Ды вось як наш паляшук у Пятра і багатым стаў. Пятро любіў знаць, як люды думаюць. Хадзіў вон у простым. Мужык арэ. Ну і загадаў ён Пятру загадку: "Як, кажа, не одгадаеш, адпішы мне сядло". Што цару сядло? "Давай". Гэты і кажа: "Чаму ў мяне галава сівая, а вусы чорныя". Не отгадаў Пятро. А той яму: "Таму шчо на дваццаць год маладзейшыя". Пятро тую загадку самым разумным міністрам. "Мужык прыдумаў дурны". А й ёны не цямяць. А паляшук і Пятра абдурыў. Сядло тое не сядло було, а сяло на Палессі.

Адкідваецца.

— Разумныя людзі былі. Не думайтэ, шчо дурныя. І тады

разумныя людзі — былі. Вось карчмар у нас з Мінска наймаў хлопцаў гарэлку вазіць. Як ні прывязуць — няпоўныя бочкі. Узмаліўся: "Хлопцы, скажыце. Нічога не будзе. Самому цекава". А яны абруч саб'юць, на тым месцы дзірачку прасвідруюць, адальюць, пасля замажуць, дый абруч на месца… Вось!.. І бочка целая, і хлопцы п'яныя… А тут настаўнік з расказаў такіх смяецца: "Не соврэменна! Не сучасна!" Каго вы саромеецеся? Адзін аднаго?

XV. Сухі шлях

Зноў пыліць, трасецца аўтобус. З Давід-Гарадка на Пінск. Зноў гайдае нас і трасе. Але мы шчаслівыя, што нават так трапілася. Выехаць было цяжка. У поўным аўтобусе звычайныя аўтобусныя размовы.

— Шпікулянты яны…

— Я конскі доктар. Жонка мая конскі доктар. Дык што нам рабіць?..

— А от цешча хацела, каб зяць дачцэ верны быў. То ёй параілі даць яму сабачай крыві з віном. Хлопчык ягоны заўважыў, сказаў бацьку — той і замяніў на простае віно. Выпіў, яешняй заеў. Цешча з жонкай яго вачыма гіпнатызуюць. Вось той сядзеў і раптам: "Гаў!", яшчэ раз: "Гаў-гаў!" Ды на чацвярэнькі, ды за цешчай па хаце, ды на двор. Тая ледзь не анямела. Ну й перастала бабскім плёткам верыць.

Пайшлі-пайшлі круціцца вакол палі, далёкія стужкі сіняга лесу, сіне-блакітныя, з рысамі готыкі, цэрквы. Маладыя пісклячасвежыя пасля дажджоў лугавінкі.

Пісклячае Палессе. Мілы гарадок Столін, які калісьці быў сталіцай цадзіка, якога найбольш шанавалі хаседзімы, а цяпер — сталіца раёна.

Зноў нізкія мокрыя паплавы з плямамі вады. Менш буслоў. Кажуць, бусел не любіць, калі барана пад ягоным гняздом жалезная або ў аснове гнязда кола з жалезным вобадам.

Шкада буслоў. Што на Ніле, што ў нас, ім менш і менш даецца месца, каб жыць. Можа, і беламу буслу суджана выгнанне ў лясы, як яго чорнаму сабрату. Ці не адвыкне тады вока чалавечае ад белага свайго сябра, ад выгляду хаты пад крыламі, і калі цяпер, каб застрэліць бусла на чучала для музея, бяруць чалавека здалёк, бо свае не згаджаюцца ні за якія грошы, то ці не стануць людзі, адвыкшы, паляваць на белых, як на чорных.

Але вось разрываецца роўнядзь, і ўдалечыні — Пінск, і ўжо няма калі думаць аб іншым, бо сэрца ўладна ўваходзіць у яго, а ён запаланяе сэрца сваімі мурамі і старымі вежамі, каштанамі і ліпамі на цяснінах вуліц, усёй вялізнай сваёй прыгажосцю, да якой ніколі не здолее звыкнуць душа.

XVI. Пінская даўніна

Пінск — адзін з самых улюбёных маіх гарадоў. Ён, як Гродна, мае сваю фізіяномію. Гэта Горад з вялікай літары, а не двайнік розных там "чаромушак", якія ў кожным-кожным горадзе — колькі б іх ні бачыў — аднолькавыя. Таму і шкада, што стандарт, ды яшчэ і нязручны стандарт, лезе і сюды, як быццам гэта ён тут гаспадар і пан.

Усё гэта, што вакол, — Прыпяць і Піна, лясы ласкавыя, паплавы мокрыя, дрэвы раскідзістыя, пчаліныя свепеты на векавых дзічках, няяркае палескае неба, — усё гэта было, мабыць, такім самым, як у часы Уладзіміра, што, паводле падання, заснаваў горад, такім самым, як і ў часы асляплення князя Васілька.

Але чалавек на працягу дзевяцісот (а можа, і тысячы) год не толькі паліў і нішчыў, не толькі ваяваў, забіваў і асляпляў — ён яшчэ і будаваў, старанна ўходжваў гэтую гліністую зямлю, вечна дбаў аб прыгажосці. Зрабіў, урэшце, на гэтай звычайнай зямлі малое дзіва, якім мы па праве можам ганарыцца.

Паліў яго хан Койдан — але жыхары зноў узводзілі вежы з гладкага дубовага бярвення. Паліў яго Нарымунт — але ўзносіўся амаль адразу Андрэем Васілай французскі драўляны касцёл. Татары вынішчалі ўсё ў наваколлі, але жыхары не толькі давалі адпор пад кіраўніцтвам Канстанціна Астрожскага, але і капалі першыя ў гісторыі Палесся каналы (1-я палова XVI стагоддзя).

Гарэў ён у сутычцы Нябабы з Радзівілам, гарэў ад рук ваяводы Валконскага і воінаў Карла XII. Але няўхільна паўставаў, прыўкрашаўся будынкамі, квітнеў працай сваіх майстроў і гандлем. Многа, дужа многа паспеў ён наашчадзіць і назапасіць, нягледзячы на шаблі заваёўнікаў. І гэта назапашанае мы павінны несці асцярожна, на выцягнутых далонях, як чашу з вадой. Старанна гледзячы сабе пад ногі, дзе там-сям зберагліся яшчэ святыя і старажытныя пінскія камяні.

Нам абавязкова трэба было разабрацца, а ці так гэта. Бо калі дагэтуль справа ішла пераважна аб памяці звычаяў, то, што датычыць самога Пінска, тут справа магла ісці, бадай, толькі пра памяць архітэктурную.

Таму трэба было пачынаць з галоўнага архітэктара. Да яго мы і пайшлі ў дзівосны будынак былога калегіума, адзін з лепшых помнікаў грамадзянскай архітэктуры на Беларусі, шматпавярховы, дзіўна велічны барокавы гмах.

Архітэктар яшчэ досыць малады, сімпатычны. Прозвішча

Заржэцкі Міхаіл Сігізмундавіч. Тутэйшы, але з дзяцінства амаль усё жыццё пражыў у Маскве. Справу ведае. Але адзін чалавек, калі яго не падтрымлівае грамадскасць, няшмат можа зрабіць.

Справа, гаворачы сцісла, вось у чым. Усе вы са шматлікіх беларускіх і польскіх гісторый архітэктуры ведаеце будынак славутага паезуіцкага касцёла. Дык вось, яго ўжо няма. А гандлёвыя рады XVIII стагоддзя, што ішлі ад яго? Фота іх ёсць нават у падручніку В. Чантурыі. Дык вось, фота ёсць, а радоў ужо таксама няма. А пафранцысканскі касцёл? Калегіум? Гэтыя пакуль што стаяць, але іхняе існаванне — не існаванне, а балансаванне паміж жыццём і небыццём. Дошкі, ва ўсякім разе, з іх зняты. Ахоўныя.

Дзіўныя справы! У паезуіцкім касцёле хацелі зрабіць піўзавод. Выявілася, многа работы па пераабсталяванні. Тады яго, моцны, як дуб, папросту ўзарвалі ў 1953 годзе, а ў 1954 разабралі. Тады стала ясна, што разбураны ансамбль і, на аснове гэтага, — калі ўжо ансамбля ўсё роўна няма, — знеслі гандлёвыя рады. Бо яны ж выпалі з агульнага. І вось цяпер пададзена ідэя зрабіць піўзавод у ацалелым пафранцысканскім. Што за піўная кароста?

Калегіум, пасля пераработкі, стаў добрым адміністрацыйным будынкам: пакоі і калідоры прасторныя, высокія, велічныя. Месца хапае на многія і многія ўстановы. Летам прахалодна, узімку, пры паравым ацяпленні, цёпла (а праводзіць яго было цяжка, бо муры ў два метры таўшчынёй). Так-сяк падрамантавалі. Каму шкодзіць яго вонкавы выгляд? Выгляд аднаго з лепшых помнікаў Беларусі.

Абапёрся на магутныя контрфорсы, як на лапы. За пятнаццаць кіламетраў з-за ракі відаць. А яшчэ каб адкрыць ягоныя аркады, выламаць адтуль сучасную цэглу — гэта быў бы палац дожаў. А пад аркадамі зрабіць — ну, хаця б летняе кафэ са старымі сталамі і кутымі свяцільнікамі. Гэта быў бы гонар Пінска і ўсёй Беларусі. Дык не. Прыехаў нейкі таварыш з Мінска, агледзеў усё і заявіў архітэктару:

— Слухайце, стаўце пытанне аб зносе — мы вас падтрымаем. Скрыня нейкая. Адной фарбы колькі выходзіць.

Архітэктару ледзь удалося адгаварыцца. Ледзь удалося адбіць і пафранцысканскі касцёл з мурам ля яго:

— Транспарту шкодзіць. Манастырскі выгляд. І ўваход з вуліцы.

А на самай справе вуліцы хапае. А як не хапае, то зносіць трэба зусім іншае.

Кожная з'ява мае два бакі. "Езуіт" стала словам-сімвалам. Але як бы мы ні ставіліся да езуітаў і да іх тактыкі, трэба, дзеля справядлівасці, прызнаць, што гэта былі самыя адукаваныя людзі свайго часу. Іншая справа, на што яны гэтую адукацыю ўжывалі.

Але ў іх былі самыя шматлікія школы і самыя багатыя бібліятэкі з выключна багатым падборам кніг, аж да вальнадумных. Таму з гэтых школ выходзілі не толькі цемрашалы, але і вальнадумцы.

Кнігі, часам найсамыя рэдкія, маглі б служыць і зараз. Але 1939 год, час безуладдзя, вайны, нарадзіў у калегіуме страшны пажар. Некалькі дзён гарэў будынак, і ў ім палалі сотні кніг. Потым другая вайна з яе разарэннем, і безуважнасць. І вось попел ведаў даўно рассеяўся па зямлі.

І ўсё адно ў некаторых людзей яшчэ бачыў я старыя пергаментныя граматы па-беларуску. Адна з іх была 1592 года. То шукайце ж вы гэта сярэдневякоўе, збірайце яго, захоўвайце ў музеях. Не здымайце дошак аховы, як з Ружанскага палаца і касцёла пафранцысканаў у Пінску, накрыйце палац чарапіцай, і сапраўднай, а не Брэсцкага завода, што пастаяла тры гады ды і асыпалася.

Ды і другі ахараніце. Пабудаваны князямі Дольскімі ў 1595 годзе для братоў-камуністаў (быў і такі манашы ордэн, у якім усё, аж да лыжкі, было агульнае). Трэба зберагчы гэтую барокавую цацачку, якой мог бы ганарыцца любы горад Еўропы, цацачку, на якой таксама няма дошкі.

І цуд драўлянага дойлідства, храм на могілках, дзе ўсё, аж да галерэі, такой тыпова беларускай, абапертай на каменныя слупкі, ёсць радасць і ціхі сум. Дзе званы вісяць між дзвюх ліп, што разыходзяцца з аднаго кораня.

Усё там радасць. І ўсё ў запусценні.

То аднавіце тое, што засталося.

XVII. "Адам быў злеплены з гліны…"

А наступнага дня мы паехалі шукаць народных майстроў. У Моталі — ткачы, у Кужэлічах — пляценне, у Іванаве — інкрустацыя, у Гарадным — ганчары.

Мы паехалі да ганчароў. Суправаджаў нас галоўны мастак фабрыкі мастацкіх вырабаў Алесь Пятровіч Ступак, мажны гэткі, тыповы ўкраінец.

Усё ж гэта было дзіва як хораша! Вёска Хлябы, што спіць у збажыне. І хоць нас кідала, хоць дарога, — не памятаю ўжо, хто гэта сказаў, - была падобная на паласу эксперыментаў гіганцкага дыназаўра, затое абапал яе цвіла шыпшына, трапляліся не зусім яшчэ зарослыя дзюны, а пасля пачаліся і лясы.

Паўла Гмыра з Гараднога не засталі дома. Адны дзеці былі ў хаце з пазелянелай страхою. Пад наглядам малой, як лялька, Тані-сінявочкі. Гэты носік з лёгкай згорбінкай вынюхаў ужо, на наша дзіва, навуку аж цэлых сямі класаў.

Паказала яна нам горшчыкі. І мы, нанюхаўшыся лазеннага водару бярозы, заторкнутай для прыгажосці паўсюль, дзе можна, пагушкаўшы малога ў калысцы, захапілі тую Таню з сабою, выйшлі, стараючыся не наступіць на "цыплюкоў", пасадзілі дзяўчынку ў машыну і пакацілі шукаць тых, хто якраз працуе. Захапілі яшчэ й сівога дзеда Казачка — і яго ў машыну, дый паехалі да Цімахвея Шэлеста, што якраз "крутыў круг".

Дзед і свае горшчыкі паказаў. Скардзіўся, што калісь рабілі букетніцы, свечнікі, коней і аж "у Варшаву вазылы", а цяпер "попыту няма". А ён, ды яшчэ Яроміч Базыль, памёр цяпер, былі найлепшыя майстры: на выстаўцы ў Пінску, у 1931 годзе, адзначаныя былі. І гліна ў іх тут найлепшая. "Ганчарская гліна, вона ня змішуецца ні з чым, вінуецца — што хочаш, то і зробіш". А попыту няма…

Я здзівіўся. Столькі ў гэтых вырабах было высокага класа паганскага прымітывізму, што кожны паставіў бы гарлач ці "банечку" (збанок) у сябе на паліцу. Чаму ж не наладуваць так, каб адны рабілі, а другія маглі купіць?

Хата ў Цімахвея Шэлеста, мужчыны нестаррга, зграбнага, хоць і худаватага, была на дзве палавіны. У майстэрні падлога земляная, ля акон лава, ля яе ганчарнае кола. На печцы гаршкі падсушаныя, на "палу" — не зусім высахлыя.

Пад столлю яшчэ адны бэлькі, на іх дошкі пакладзены, а на дошкі гаспадар ставіць зусім сырыя гаршкі.

— Ну, давай паспрабуй узяць.

— Самну.

— А ты не душы, не цісны. Ты беры, от просто беры.

Сапраўды, удалося ўзяць і панесці.

— Колькі ж вы, дзядзька, працуеце?

— Як зародыўся. З сямі год. Значэ, год сорак.

Сядае на лаву. Густыя чорныя бровы, гарбаты нос, шырокае ўсмешлівае аблічча чырвонага колеру. Клятчастая сіняя сарочка, заляпаныя глінаю порткі.

І вось пасуровеў. Позірк стаў пільны. Як ужо бачыць у глінянай нашлёпцы будучую рэч.

Міска з каламутна-рыжай вадою побач, шэра-блакітная гліна — на коле. Крутануў нагамі і — пайшоў…

Часам мочыць пальцы ў місе і цягне. Гліна выцягваецца, сціскаецца, шырыцца і пухне. Што будзе? Цукарніца, макотра, гаршчочак? Ён і сам гэтага пакуль не ведае. Гэта ён іграе, прымяраецца, радуецца пакорлівасці матэрыялу.

Гліна, — не, ужо не гліна, — тоўста спаўзае, то ўгору, то ўніз. Вось выцягваецца ўгору Вавілонская вежа. Пальцы лісліва і мякка паўзуць унутр, робяць сярodку, змочваюць, цягнуць яшчэ ўгору. Цяпер ужо можна зразумець, што робіць "баньку". Рука залазіць амаль па локаць, шліфуе знутры. Выпаўзае. Вось адзін палец вызваліўся, нібы паказвае кудысь, астатнія прагладжваюць горла.

Круцяцца, нібы танцуюць, ногі. І танцуюць пальцы. І выцягваецца, выцягваецца рыльца. І вось гатова, і вось ужо, каўбаскай, ручку. І ніткаю адразае баньку ад кола, і ў хаце, пабеленай блакітнай глінай, адразу нібы робіцца святлей, такая банька зграбная.

— Майстра, — кажа дзед Казачок. — Шэлест — самы скоры ганчар.

Памаўчаў:

— Наша прохвесія самая старая. Адам буў злеплены з гліны. Бог буў першы ганчар.

І нельга зразумець, ці то ён жартуе, ці то ён гаворыць з сур'ёзным гонарам.

— Мы колысь рабілы велькія глякі. Звалыся "палякі". Не було кадушак, то рабілы для насыпкі. Вялізныя. То і станок быў іншы. І ганчар стаіць наўколішкі, а руку ўнутр да падпахі цягне. Цяпер забылі.

Ківок на цяперашняе ганчарнае кола:

— Ужо і гэтага дзеці не вучацца.

— А як вучылі?

— З папружкой вучылы.

— Ну а я навучыўся б?

— Хоч два гады вас папружкай бі — не навучыш. Тэпэр не

навучыцеся. Гэта дзела з маленькосьці.

Глядзіш, як зачараваны, на працу гэтых рук, адчуваючы сваю нікчэмнасць. А дзед пляце далей няспешныя свае славесы:

— Вся Гарадная на гліні. Яе яшчэ будэ на міл'ён літ. Яе нэ пэрэробыш. Такая гліна была толькі на кашубі, як у нас. Дзве трэці людзей банькі ляпілі, а то і болей. З тых год, як царква ў нас. А ёй з трыста пяцьдзесят год. Можэ, і раней ляпілы, але то ўжо точно, бо папы запісвалы.

Усміхаецца і Шэлест:

— У нас тут еслі не ўміў гаршкі робыць, то дзеўкі не йшлі замуж. Не підзе, бо што ж, як не ганчар…

— А за цябе ішла? — пытае нехта з гледачоў.

Дзед падкусвае:

— Падманіў, сказаў, што ўміе.

— Вывучыўся, шчоб жаніцца, — парыруе Шэлест.

— А чаго ж гэта, дзеду, маладыя не вучацца?

— Работа гразная, дзяшовая, — дзеду відавочна крыўдна за сваё ўмельства і за ўмельства яго спрадвеку ганчарнай вёскі. — Зрабіць зробіш, а выпаліш — трэця часць астаецьця. Стукнеш — выб'ецьця, паліш — выб'ецьця, аблываеш — выб'ецьця. Багатыром ніхто не буў. Калаціліся, а жылі. Не для хліба, а шчоб людзям… Не ў прыгоршчах жа ім варыць… Ну, гразная, кажу, работа, дзяшовая, але і тую некалькі год толькі як папусцілы. Дзяшовая, ды і тую не давалы рабіць. Дзе горан быў — дык пяць-шэсць год назад, за кукурузным часам, трактарам пабілі, бульдозерам панішчылі. Прадаваць не давалы. Заробак з той работы, ды і то ў зімне врэмя, — на тытунь, а на рынку не бяруць, а рынак бярэ… Калісь-то ў нас жанчына-опікун була, выставы рабілі, не чыпалы нікога. Як пабачуць, шчо робіш, не возражалы. А тут. Хіба зараз такі горан зробіш ужо, які буў? - І з нейкім гаротным неўразуменнем: — Ці ты ўкраў, ці каго забіў? З зямлі сам зробіў.

Памаўчаў:

— Цяпер рабі, можно. — І зноў пасля паўзы: — Ды позна. Хто рабіў — кінулі, плюнулі. Іздзяць на заробкі. Што ўжо казаць. Канец ганчарнаму Городному.

…У мяне было дужа смутна на душы. Каму гэта ўсё было трэба? Сотні год існаваў промысел. Мала таго, існавала мастацтва. І вось бульдозерамі. Добра, зараз усё выпраўлена. Зараз імі цікавіцца фабрыка мастацкіх вырабаў, памагаюць мастакі. Іхнія творы зноў адпраўляюць на выстаўкі. Але фінансавая палітыка нядаўніх год пашкодзіла промыслу, загубіла мастацтва. Пойдуць старыя майстры — і што тады застанецца ад яго?

…Царкве ў Гарадным, вядома ж, не 350 год, хаця кнігі,

цалкам магчыма, вядуцца з таго часу. Але што сярэдняя яе частка з XVIII стагоддзя — гэта, мусіць, так.

Стаяла, мабыць, маленькая адназрубная цэркаўка (дзед сказаў: "ад патопа, як кажуць"), пасля да яе прыбудавалі яшчэ адзін зруб. І атрымалася тры зрубы і два шатры.

У інтэр'еры ёсць дзве досыць каштоўныя і, галоўнае, арыгінальныя рэчы. Адна — наіўны, амаль лубачны, абраз маці божай уніяцкіх яшчэ часоў, з букетам лілей, сэрцам і какетліваю ўсмешкай. Не хачу абражаць майстроў і сам культ мацярынства, але з лілеямі, з усмешкай і, галоўнае, з сэрцам яна атрымалася крыху падобнай на чырвоную даму.

Ёсць і яшчэ адна работа. Сапраўдны народны прымітыў XVIII стагоддзя. Уезд Хрыста ў Іерусалім. Прапорцыі вельмі парушаны. Сам Езус вышынёю з вежы горада. Галава ягоная — трэцяя частка ад усёй постаці. Круп каня і заднія ногі — вялізныя. Галава і пярэднія ногі маленечкія. Як ні дзіўна, гэта стварае страшэнна дынамічнае ўражанне. Здаецца, конь (конь, а не асёл, бо адкуль было жывапісцу таго асла бачыць), здаецца, гэты конь скача. А вежы Іерусаліма, вежы нейкай невядомай архітэктуры, пафарбаваныя палосамі: ніжні ярус шэры, дах яго аранжавы, верхні ярус белы з зялёным дахам.

Шкада, што ў мінскім музеі так цесна і так мала адведзена месца неацэннай нашай старой скульптуры і жывапісу. Нам, беларусам, ёсць чым ганарыцца і ў гэтым сэнсе. Не менш, чым іншым.

Зноў былі тлустыя чорныя дарогі з глыбачэзнымі каляінамі, налітымі вадой. І ніводнай машыны, акрамя "казла" ды тых, што ходзяць хлебнай парай.

Пад сонцам, пад спеючымі хмарамі цвіла ўсцяж дарог шыпшына.

Так, Адам быў злеплены з гэтай гліны. З гліны, абпаленай ачышчальным і святым агнём.

XVIII. Кароль уюноў, або некалькі марных думак аб Пінску

Брыдкі інцыдэнт адбыўся з намі ля царквы Варвары. Ішла "рэстаўрацыя", то-бок на дах ставілі нешта дужа падобнае на хвігу. Пры выключным барокавым франтоне праз дах лезла цыбуліна на драўляным барабане. Не паспелі мы нават папрасіць дазволу паздымаць, як да нас падляцеў "рэстаўратар", царкоўны стараста з кучай цэменту ў галаве і ашалелымі вачыма:

— Не пазволю! Вон атсюда! — і выбухнуў непрыстойнай лаянкай.

Свяшчэннік, калі звярнуліся да яго, толькі рукамі развёў, не памаглі і дакументы.

— Я служачы. Уся ўлада — царкоўны савет.

Мы паспрабавалі пераконваць, але стараста налятаў з выглядам байцовага пеўня, і нам стала ясна, што пры такім клопаце старажытная царква застанецца стаяць. Нават калі прышыбеевы ад царквы не дазволяць ніводнаму мастаку, ніводнаму знаўцу і аматару народнага мастацтва ўвайсці ўнутр, сфатаграфаваць ўсё сапраўды каштоўнае і апісаць яго нехлуслівым словам павагі.

Мы махнулі рукой і, збянтэжаныя, не ведаючы, смяяцца нам ці абурацца, пайшлі прэч.

Такі ва ўсім гэтым быў прымітывізм мыслення, нібыта мы перанесліся на стагоддзе назад.

Я сядзеў на адхоне за калегіумам і ўяўляў сабе Пінск, якім ён быў год 120 назад. Мне лёгка было ўявіць гэта, бо варта было толькі ўзняць галаву — і ўбачыш чароўныя краі барокавага франтона, закручаныя, як струцаль з макам. Акрамя таго, у Крашэўскага, у ягоных "Успамінах Палесся, Валыні і Літвы", ды ў Аскара Кольберга, у ягонай кнізе "Беларусь — Палессе", ёсць досыць добрыя апісанні горада. Як зараз рака, як зараз лясы, — і таму яшчэ лягчэй уяўляць. Таполі над ставамі, яўрэйскія корчмы, ветракі, як на пакуце. За ракою хаты, напалову ў зямлі, а ля іх — худыя сабакі.

Грэблі, на якіх яздок клацае зубамі. Чумацкія фурманкі, што вязуць на Іоўдзень хлеб, а адтуль соль і сушаную рыбу.

Ля рагатак на вазах шукаюць гарэлку.

"Зорка наваколля" амаль уся драўляная, зрэдку мураваная. Але яна на шляху між Балтыйскім і Чорным морамі. Яна багата гандлюе, хоць і жыве ў гразі. У яе хапае грошай, каб узводзіць

магутныя муры і вежы. Над горадам, над замчышчам высяцца сем ці восем званіц. Асабліва ўражвае велічынёй, масай каменння паезуіцкі касцёл. Ёсць у ім і яшчэ адна славутасць — напалову замураванае акно, на якім намаляваны дзве постаці ў турэцкім адзенні. Яны гавораць між сабой. Жыхары кажуць, што гэта дзве ахвяры, забітыя пад час будавання, але ўборы супярэчаць гэтаму, ды і надпіс таксама: "Мы абрашчаем няверных".

У гэтым касцёле ў 1657 годзе, калі напалі казакі, быў забіты пад час імшы Андрэй Баболя, пасля кананізаваны.

Крашэўскі і Кольберг прарочылі, што горад стане паходняй гандлю. Але яны не ўлічылі чыгунак і аўтамашын. Усё ж горад паспеў набудаваць мураванак.

Ужо засынаючы, я ўспомніў пра ўлюбёны, ад прадзедаў успадчаны пінчукамі розыгрыш.

Свежаму чалавеку, які ўюноў і на вочы не бачыў, казалі, што каля моста, пад ім, плавае кароль уюноў. Злавілі, маўляў, але такі быў вялізны, сажняў на дзесяць, што не здолелі выцягнуць. Прыкулі на ланцуг, прывязалі да сваі і пакінулі плаваць, як своеасаблівую славутасць горада. Падкармліваюць, каб не здох: усё ж слава гораду. То вось, ці не хочаце, васпане, паглядзець? Васпан, ясна, хацеў. Гэткае дзіва! І вось яны вадзілі па мосце і па берагах, па балоце, глядзелі, "куды адплыў", казалі "вось-вось там, здаецца". А на беразе стаяла куча зявак і аж надрывала жывоцікі. Такім чынам, у Пінску кожны дзень была свая забава і сваё "Prima aprilis".

Ніхто ўжо не пажартаваў так з намі. Адышоў у нябыт нават гарадскі жарт. Усё адыходзіць.

XIX. Семдзесят пяць анёлау з гакам

Пінскі катэдральны касцёл — адзін з лепшых будынкаў, якія мне даводзілася бачыць на Беларусі. З першага позірку на ягоную абсіду, магутную, як грудзі закутага ў латы волата, — нараджаецца ў сэрцы нешта падобнае на пачуццё велічы: я не зусім малы чалавек, калі я нашчадак дойлідаў і каменшчыкаў, якія маглі збудаваць такое!

Калісьці ён, разам з прылеглым да яго кляштарам, належаў "братам мнейшым канвентуальным закону святога Францішка". Заснаваны ён у 1396 годзе Зігмунтам Кейстутавічам, князем Пінска, Турава і Старадуба, але быў ён тады драўляны. Пасвяціў яго біскуп Віленскі Андрэй Васіла. За тры стагоддзі будынак перанёс тры пажары. Першы ў 1618 годзе. Дзевяць год яго адбудоўвалі, але ў 1648 годзе ён згарэў другі раз пасля аблогі горада і страшнай "пінскай разні", калі згарэла пяць тысяч дамоў і было забіта чатырнаццаць тысяч чалавек. Згарэла тады толькі яго драўляная частка, бо тая самая велічная абсіда была ўзведзена яшчэ ў 1509 годзе (гораду тады не хапіла сродкаў зрабіць каменнай усю будыніну). Да абсіды ў другі раз прыбудавалі драўлянае памяшканне, але ў 1705 годзе агонь знішчыў і яго. Тады жыхары ўзяліся, нарэшце, мураваць цалкам каменны храм і адкрылі яго 1 мая 1730 года. Вось так за дзвесце дваццаць адзін год была, урэшце, скончана гэтая тытанічная праца.

Сапраўды тытанічная. Бо як улезлі ў маленькую сігнатурку на даху (Зянон з Валянцінам ледзь не скончылі там сваіх брэнных жыццяў, бо падламаўся прыступак лесвіцы), то ад відовішча займае дух. Магутныя вежы, лускаваты, як спіна дракона, дах, велічныя завіткі барокавых франтонаў. А ўнізе, у недасяжнай, страшнай глыбіні, блытаніна вузкіх двароў, лабірынт пераходаў, дахі, муры. І ўвесь горад як на далоні, і далёка-далёка віецца сіняя Прыпяць.

Перакрыцці і каркас з бярвенняў, на якіх ляжыць дах, шэдэўр інжынернага разліку і ўмельства нават цяпер. Гэтае перапляценне стаякоў, распорак і падпорак, расцяжак і звязак стварае ўражанне, нібы ты знаходзішся ў чэраве нейкай неверагодна складанай машыны. І адначасова ва ўсім відаць розум будаўнікоў, прастата, мэтазгоднасць і дакладнасць.

Муры фантастычна тоўстыя, а для палёгкі, лепшага рэзанансу і вентыляцыі ўся тоўшча іхняя праточана калодзежамі і хадамі. Тутэйшы арган быў пастаўлены ў 1833-1887 гадах архітэктарам Градзіцкім, а галасы для яго з чорнага дрэва, спецыяльна

мочанага і сушанага, сканструяваў выключны наш майстар арганаў Рудніцкі з Вільні. Тады арган быў аб дзевятнаццаці галасах і двух мануалах з педаллю клапаннай канструкцыі.

У 1936 годзе яго рэканструяваў майстар Бярнацкі. Ён дадаў шэсць новых галасоў, а старыя дапоўніў новымі трубамі. Частку іх ён замяніў на сталёвыя, і арганіст, вялікі майстар сваёй справы і знаўца музыкі, і цяпер незадаволены гэтым: "Са старымі, драўлянымі, было лепей". Педаль цяпер пнеўматычнай канструкцыі.

Не ведаю, як там было раней, але і цяпер гэта велічна і здорава. Ды і вонкавы выгляд гэтых срэбных трубаў, цёмнага золата капітэляў, блякла-зялёнага асноўнага фону здзіўляе гарманічнасцю.

Вадзіў нас па будынку, ад зялёнага дворыка з чатырох'яруснай званіцай ("здымі шапку, бо ўсё адно званіца табе яе скіне") і аж да канструкцый гары і лазаў у сценах добры знаўца мураў і ўвогуле старажытнага Пінска і Піншчыны сіваваты ўжо, харошы чалавек з усмешлівым і разумным аблічам Казімір Свёнтак. Па-сапраўднаму здзіўлялі ягоныя веды, памяркоўнасць і шырокі падыход да з'яў жыцця. А асабліва здзіўляла спалучэнне сапраўднай улюбёнасці ў старажытнасць і дасведчанасці ў ёй з сучаснай любоўю да тэхнікі. Дужа харошы фатограф, матацыкліст, кінематаграфіст-аматар (зараз здымае фільм аб прыродзе Палесся), чалавек, які здатны цэлую ноч нерухома праляжаць у лесе, толькі каб запісаць на магнітафон такаванне глушцоў.

Пра помнік, пра кожную скульптуру ён мог гаварыць гадзінамі, і ўсё гэта было цікава і з веданнем справы. Гэта ён даў назву гэтаму раздзелу, расказаў, што раз прыйшло яму ў галаву, што дрэнны ён знаўца і не гаспадар над старыной, калі не ведае, колькі анёлаў у касцёле. Ну і пачаў лічыць. Фігуры на абразах, на роспісах, статуі на галоўным алтары і на алтарах бакавых. Налічыў семдзесят пяць, збіўся і махнуў рукой. Нельга палічыць. Так што тут іх, анёлаў, семдзесят пяць з гакам. А беларускі гак, бывае, і ў сотню не ўлезе. Гэта самыя дакладныя звесткі, а калі каму трэба больш дакладныя — хай лезе і лічыць сам.

Тут, між іншым, акрамя абразоў шмат карцін, часам дужа старых і каштоўных. Напрыклад, "Зняццё з крыжа і аплакванне". Вернае XVII стагоддзе. Акрамя манеры, цікава яшчэ і тое, што аблічча Хрыста не відаць: твар схілены, на яго ўпалі валасы. Мастак лічыў, што ён няварты гонару, маляваць гэтае аблічча.

Паабапал алтара таксама дзве познія карціны С. Рудзінскага: "Зняццё з крыжа і нараджэнне". Цікавыя яны каларытам. Сапраўдным палескім каларытам. Калі валхвоў мастак апрануў

яшчэ ва ўсходнія строі, то астатнія гледачы — сапраўдныя старазаветныя пінчукі ў вясковай вопратцы. Наміткі, світкі — "латухі", шэрыя з чырвонымі паясамі, вярэнькі з бяросты ў руках.

З новых карцін ёсць карціна Альфонса Ромера "Маці божая ў промнях", якой не пасароміўся б кожны першакласны музей.

Ды і абразы ёсць дужа каштоўныя і старыя. На адным — Маці Божай — ёсць вотум 1507 года. Значыць, абраз павінен быў ужо мець славу, а гэта справа доўгая. Значыць, майстар зрабіў яго ў XIV стагоддзі.

Ёсць некалькі дужа добрых работ XVI–XVII стагоддзяў. Напрыклад, два абразы святога Антонія-францыскага. Тут усё дыхае даўнімі вякамі, нават асаблівасці перспектывы. Напрыклад, чым чалавек на абразе далей ад гледача, тым вышэйшага росту робіць яго жывапісец.

Другая рэч мае прысвячэнне ад 1620 года. А ў пачатку XVIII стагоддзя яе ўзялі ў срэбную сукенку, якая — сведчанне таго, што ў чаканшчыкаў і басменных майстроў беларускіх былі залатыя рукі і вытанчаны густ сапраўдных мастакоў.

Да чаго я не люблю варварства! І як яно, на жаль, яшчэ здараецца ў нас… Вось ускрываюць могілкі на Завальнай вуліцы. Труны XIV стагоддзя, доўбленыя з цэльнай калоды і абвітыя бяростай, так званыя корсты, чэрпалі каўшамі экскаватараў і вывозілі на звалку… Вось два п'яныя ўрываюцца ў касцёл і крычаць: "Крышыць усё!" І крышаць. Добра, што абласны цэнтр даў справядлівы і суровы загад: "Судзіць".

Ксёндз, на жаль, дараваў. І неразумна зрабіў. Я б не дараваў нізавошта. Не таму, што такі ўжо крыважэрны. А таму, што быў бы ўрок на будучае іншым. Таму што разьблёныя алтары XVI–XVIII стагоддзяў не толькі стварэнне рук нашых продкаў, а і проста дзіва рук чалавечых, якое належыць не толькі нам. І не на "ачаг цемрашальства" ўзнялі гэтыя два хуліганы свае кіі, а на годнасць народную, на яго мастацтва, на ягоную гісторыю і павагу да мудрасці продкаў.

Але што я? Народ выкажа свае адносіны да такога лаканічней. Заб'е адным словам.

…Студэнты трэслі краты капліцы на могілках, нібы арангутангі ў клетцы. Вартаўніца падышла, паглядзела на іх і сказала адно толькі слова:

— Няшчасныя.

І праўда, няшчасныя.

У такіх ні да чаго няма павагі. Нават да слова. Ім нічога не каштуе перайменаваць Скорбічы пад Брэстам у Дружбу, а Завальную вуліцу ў вуліцу Пабеданосікава.

Але вернемся да прамой нашай справы. Да мастацтва. Да таго

вялікага, якога "няшчасным" не забіць. Вернемся ўнутр муроў.

Галоўны алтар пафранцысканскага касцёла ўстаноўлены, як і ўсё тут, аж да канструкцый даху, на магутных — зносу ім не будзе — шматсотгадовых бэльках з сасны і дубу.

Наконт якасцей дубу — распісваць і хваліць не трэба. Але вось як рыхтавалі продкі сасну дзеля такіх мэт, як апоры і перакрыцці. Каб стагоддзі стаяла і не гніла. Зімою выбранае дрэва, — спелае, але не пераспелы семяннік, — туга, з дапамогаю калаўрота, перацягвалі тросам ля самай зямлі і так пакідалі. Дрэва павінна было быць цалкам здаровым, без заганы і пашкоджанняў кары. Цэлы год росту яшчэ быў дадзены яму, і жывіца накоплівалася ў кожнай поры, у кожнай клетцы дрэўнай тканкі. Наступнай зімой дрэва ссякалі і сушылі пад павецямі, даступнае ветру, але недаступнае дажджу. Вычасаны з такога бервяна брус — "уванчос" — быў набрынялы мікраскапічнымі кроплямі смалы аж да цёмна-янтарнага колеру, звонкі, практычна непадуладны тлёну і надзіва цвёрды: цвік забіць цяжка. Урэшце, ніхто тых цвікоў амаль і не забіваў. У месцах злучэння бярвенняў свідравалася дзірка, а пасля ў яе забіваўся драўляны шып. Жалезная ржа, якая так раз'ядае дрэва вакол цвіка, не пагражала канструкцыі.

Ведалі майстры тых часоў і нейкі састаў супраць агню, сакрэт якога цяпер не вядомы. Таму і не дзіва, што пасля пажару драўлянай царквы або касцёла часам згарала толькі абшыўка, а сама будыніна, ад сцен і да шкілета крокваў, заставалася стаяць, толькі злёгку закураная, як фенікс, што выйшаў з агню. На гэта, ясна ж, паказвалі, як на божае дзіва.

Састаў быў, мабыць, дарагі, і пакрыць ім усё было немагчыма. Але дранка на дах нічога не каштавала, як і ўвогуле дрэва ў тыя часы. Дзеля новай абшыўкі трэба было ўсяго толькі некалькі дзён пацюкаць сякерай. І вось за тыдзень-другі будынак зноў бялеў свежымі сценамі і ўзносіўся ўзорным вільчыкам, нібы полымя і не жэрла яго.

Дык вось галоўны алтар і ўмацавалі такімі бэлькамі. Старасвецкай разьбы, двухпавярховы, укрыты скразным танчэйшай работы кіпенем кветак, пялёсткаў, завіткоў. Фігуры на ім часткова маляваныя, часткова залочаныя, але залочаныя, як і ўсё тут, высакародна, з густам і без усялякай крыклівасці.

На адным паверсе — узнясенне Маткі Боскай. Нават вельмі нядрэнная старая копія з Мурыльё: поўная глыбокага і светлага суму туманная сінь цераз густа-сіні плашч жанчыны пераходзіць у радасны, ружова-залацісты, вечны ўсход.

Някепская і ўкленчаная постаць св. Францішка (стыгматызацыя). Шырокія, тоўстыя хлапякі аблокаў. Анёл, што

ўзлятае над званіцай. Нагрувашчанне цел і ўзнятых рук. Ва ўсім гэтым простая, крыху прымітыўная веліч і адначасова пышнасць. Хоць і з дрэва.

А фігуры алтара пад столлю з народнымі візарункамі! Дыспрапарцыянальныя, з выразам смешнай журбы або здзіўленай усмешлівасці. Ва ўсім адзін і той жа кранальны прынцып старых нашых майстроў: у статуях святых усё павінна быць "так, як у людзей, ды не так". Вось святая манерна падбірае падол з адной прыгожай ножкі, нібы збіраецца ісці па вадзе. Добра!

З правага боку ад галоўнага алтара першы алтар св. Францішка, таксама ўвесь разьблёны, маляваны, пазалочаны. У ім стары абраз. Сухое, копчанае аблічча нагадвае формамі стары факомскі партрэт. Стыгматызаваныя рукі надзіва ненатуральна маленькія. І добра, што срэбная шата прыкрывае ўсё цела. Бо на астатняй частцы ўжо цяжка што-небудь разабраць, і работа дужа патрабуе ачысткі, каб ізноў заззяць прамытымі, першароднымі фарбамі. І ўсё ж глядзіш на гэтае ягня, падобнае ці то на льва, ці то на сабаку, рахманае, з наіўна закінутай, пяшчотна маленькай галавой, глядзіш на праваленыя ля вачэй, здзіўленыя абліччы "прадстаячых". І рэч пачынае гучаць у душы, як напаўзабытая музыка.

Анёлы на алтары, дый паўсюль, не анёлы, а іранічная радасць. Пухлыя задкі, круглыя пузічкі. Усе яны тоўстыя і надзьмутыя, крыху асавелыя, нібы толькі што добра паабедалі. Мілыя тоўстыя мардахі (некаторыя нават кірпатыя) без усялякай адухоўленасці. Глядзяць на свет божы сіне-цьмяна-каламутна, як малыя шчанючкі, з адной толькі сытай радасцю, што вось до-обра жыць.

Іх, як я ўжо казаў, семдзесят пяць з гакам, і, нягледзячы на агульнасць выразу на абліччы, уже яны розныя. Каб мы былі ўважлівыя, дбайныя і нават скупаватыя гаспадары, каб сотнямі выпускалі альбомы па мастацтву для сябе і турыстаў — патрэбная была б асобная манаграфія-альбом "Анёлы Пінскай катэдры". Дужа каштоўная і патрэбная, дужа цікавая магла б быць рэч.

Што тут яшчэ? Вось алтар Маці Божай, зноў жа разьблёны і залочаны, мае два абразы. Малы на блясе, слабаваты, а вось вялікі, на дрэве, гэта XVII стагоддзе. Гэта напэўна.

На трэцім алтары досыць старая і досыць цікавая карціна на палатне: святое сямейства і голуб у ззянні над імі. Яе някепска было б вывучыць знаўцу, як, урэшце, і многае з таго, што мы бачылі.

Другі алтар з левага боку ад галоўнага — адна з найбольш тут цікавых з'яў. Не кажучы ўжо пра незвычайна тонкую разьбу, пра галоўны стары абраз, дзве бакавыя, з жыцця святога

Францішка, дужа старыя работы. Есць нават рысы XVII стагоддзя, але, можа, гэта намераны архаізм ці стылізацыя або проста прыхільнасць глухога кута да крыху спозненай моды. І ўсё адно гэтая архаічная кампазіцыя, гэтыя порцікі фантастычнай, небывалай архітэктуры — усё гэта прыўкрасна.

Разьблёныя рэчы касцёла таксама розныя, Ад спавядальнікаў мясцовых, вырабу школы рамёстваў, у Пінску недзе ў трыццатых гадах, але зробленых з густам і без таго, каб яны парушалі агульны настрой і тон інтэр'ера, і да амбона разьблёнага, штукі велічнай, высакароднай, пышнай і, сказаў бы я, нават велікапышнай.

Словам, усё гэта — веліч, усё гэта — мастацтва, усё гэта — наша. І таму, што гэта ўвогуле душа продкаў нашых, майстроў. І таму, што гэта веліч нашай гісторыі.

XX. Адзін на палескіх шляхах

Тут, у Пінску, шляхі нашы разыходзіліся. Хлопцы павінны былі вяртацца ў Мінск, а я вырашыў усё ж перасячы Палессе да канца, прайсці апошні адрэзак шляху і такім чынам прыдаць падарожжу характар завершанасці.

І вось мы развіталіся на набярэжнай, я ўскінуў на спіну пляцак і, махнуўшы ім рукою, рушыў над вадка-залатой, злёгку туманнай ракой. Ранішняе паветра яшчэ не страціла ласкавай свежасці, нібы з бронзы кутыя, высіліся ў ім францысканскія вежы, з якіх ляніва планіравалі першыя галубы.

Чакалі дарогі, мяккі пыл на іх, прыдарожныя крамы, задушна-залатая спёка дня, жоўтае хваляванне баркуна на ўзмежках і коршакі ў сляпучых, цяжкіх аблоках.

Я ехаў аўтобусамі і спадарожнымі машынамі, ішоў пешшу, перапраўляўся цераз рэчкі і каналы, закідваў вуды ў спакойныя завадзі і абрываў кручкамі гарлачыкі, урэчнік і расіцу. Сузор'е Рэшата ўначы мігцела нада мной і рыбы, тлустыя ад ашыткаў, непаразумела глядзелі з-пад вады на маё вогнішча.

Ноч. Туман устае над нізінамі. Аднекуль песня. І ўжо значна менш у яе палескага, а хутчэй мяккі косаўскі акцэнт. Калісьці я чуў такую у Быцені. Але як пранізліва, як прытомна і журботна гучыць яна між гэтых дрэў, над гэтымі рэкамі і туманамі!

І з-пад лесу і з-пад гаю
Цёмна хмара выступае.
Барлак ногі падымае,
Усю радзіму праклінае.
"Ты, радзіма, ты, радзіма,
Нашто ж мяне парадзіла?"

Спакой. Туман. Тужлівы крык савы.

І зноў дзень. І зноў ноч. Але вечныя туманы над нізінамі. І вечна гучыць уначы — здалёк і на дне душы — незабыты звон з прадонняў. Кліча Князь-возера, і адказвае яму Белае, і захлынаецца ў маленні Бабровіцкае, заклікаючы возера Пагост.

Звон амаль нячутны. Нібы з даўняй музычнай скрынкі. Нібы нешта мяккае чапляецца за меладычныя голкі на валку, і залатыя пчолкі лётаюць вакол званочкаў і часам ціха ўдараюць па іх.

…Мне здалося, што адзін з гарадоў ужо ўсплыў, калі я праходзіў паўз пяціярусную, трыццаціметровую, сямісотгадовую

Камянецкую вежу, і я канчаткова ўпэўніўся ў гэтым, у тым, што сёе-тое ад іх засталося і на зямлі, каб мы памяталі іх і сумавалі па іх, калі я выходзіў васільковымі палямі да Чарнаўчыц.

Срэбна плылі і хвалявaліся вербы, зелена плыло высокае жыта, беллю і чырванню пераліваліся над ручаінамі рамонкі і смолкі. Сцежка нырала ў палях, і залатыя парушынкі пчол завіхаліся над малінавымі шарамі канюшыны. Над усім гэтым раскашаваннем грувасціліся беласнежныя вежы аблокаў, а першыя ярусы іхнія былі шызыя, як дзікі камень.

А паміж палёў і аблокаў, нібы злучаючы іх, стаяла белая будыніна ў сакавітых зялёных шатах. Нібы ўломак снежнага горада, які праваліўся да сэрца зямлі. І я рушыў ёй насустрач, ведаючы, што яна не адштурхне мяне, бо я нясу ў сэрцы дабро і мір.

XXI. Адраджэнне

Кажуць, што першая культавая пабудова з'явілася тут ў XIII стагоддзі на месцы паганскага капішча. А тое, мабыць, існавала з першага пасялення людзей у гэтых мясцінах. Стагоддзі сплывалі, мяняліся і цяклі плямёны па твары зямным. Тыя, даўнія, нават імёны якіх не зберагліся, пра якія мы нават не ведаем, хто яны былі такія. Готы ў другім стагоддзі ішлі тут да цеплыні, да далёкага Чорнага мора, якое вабіла іх гарачай сінню і чуткі аб якім дайшлі невядомым чынам на іхнюю туманную поўнач. Ішоў авангард воінскіх атрадаў з узброенымі, грубымі, як зубры і як готскія сагі, мужчынамі, а за імі бясконца цягнуліся абозы. Іржалі коні, плакалі дзеці, лаяліся і вішчалі жанчыны, клубіўся, устаючы да неба, пыл, і ў ім крычалі колы вазоў.

Пакідаючы за сабою мужчынскія могільнікі (частку, самы край аднаго з іх, нядаўна раскапалі ў Трышыне), плацячы мускуламі, крывёю, жыццём, валіла, ірвалася на поўдзень арда.

— Наперад!

А праз два стагоддзі паўдзённыя плямёны турнулі іх ад Чорнага мора, і яны цяжка пакаціліся назад ужо зведаным, ужо аплачаным жыццямі, крывавым сваім шляхам, па дарозе — цяпер ужо назаўсёды і без надзеі вярнуцца, — развітваючыся з магіламі продкаў і братоў, што навекі засталіся ляжаць на гэтым шляху, адплаціўшы самімі сабой два стагоддзі жыцця ля мора, пад сонцам і сінімі пырскамі прыбою, аплаціўшы туманныя легенды сваіх плямёнаў пра навекі страчаны рай.

Шчаслівы выпадак памог нам выкапаць два скарбы, якія маглі б быць сюжэтам для змрочнай балады, а то і цэлага эпасу.

Скарб другога стагоддзя. На наканечніку дзіды рунічны надпіс: "Наперад!"

А на такім жа наканечніку чацвёртага стагоддзя тыя ж суровыя вуглаватыя руны: "Назад!"

Зніклі старажытныя плямёны, зніклі готы і дзесяткі іншых, у чаргаванні прыліву і адліву адплывалі і зноў наплывалі, змешваючыся, яцвягі і славяне, а парэпаныя дубовыя ідалы капішча, мяняючыся з новымі гаспадарамі, усё глядзелі і глядзелі на гэтыя змены, на дымы вогнішчаў, на пыл над дарогамі сляпымі і страшнымі дубовымі вачыма.

У XIII стагоддзі Іллініч узвёў на гэтым месцы першы драўляны храм. А ў 1583 — 1585 гадах на яго месцы з'явілася дбаннем Мікалая Радзівіла Сіроткі і рукамі геніяльных дойлідаў і муляраў тое дзіва, што бачым мы зараз, што яшчэ здалёк убачыў

я, ідучы да яго канюшыннікамі.

Час быў неспакойны, круляванне Баторыя. Толькі што скончылася Лівонская вайна і рыхтавалася новая. Хто ведае, што несла пераменлівае ваеннае шчасце? І таму храм зрабілі крэпасцю з магутнымі мурамі, цяжкімі круглымі вежамі, трывалымі скляпеннямі і пагрознымі вузкімі байніцамі.

У чалавека, які фундаваў яго, былі разнастайныя густы. Нясвіжскаму касцёлу, таксама збудаванаму ім, не трэба было быць крэпасцю, побач стаяў магутны замак. І таму ў Нясвіжы пышнасць і адкрытасць ранняга барока, а тут, у Чарнаўчыцах, псеўдаготыка з рысамі рэнесансу. Але і ў тым, і ў іншым паўсюль сімвалы эўхарыстыі. Вінаград — гостыя, вінаград — гостыя. Хлеб і цяжкія гроны з узорнымі лісцямі. І матыў тайнай вячэры і шматлікія арлы.

Дужа цікавае, я б нават сказаў, унікальнае скляпенчатае, пасечанае вяззю скульптурных візарункаў перакрыццё касцёла. Гэта досыць рэдкі на Беларусі рэнесанс. І калі, скажам, палякі могуць ганарыцца ў гэтым сэнсе такімі цудоўнымі рэчамі, як Зыгмунтаўская капліца на Вавелі, замак у Баранаве, двор у Пабяніцах, ратуша ў Хелмне і яшчэ многа-многа чым, то нам тым больш трэба берагчы тое нямногае, што збудавана ў гэтым стылі ў нас. Прычым гэта адраджэнне, успоенае мясцовымі манерамі будаваць, мясцовымі традыцыямі і густамі, мясцовым пачуццём гармоніі.

З першага позірку ўнутранае абсталяванне касцёла здзіўляе аскетычнай беднасцю. Каб не шыкоўнасць і пышнае багацце скляпенняў з іхнімі складанымі візарункамі і золатам разетак, яно здавалася б нават проста ўбогім. Што тут ёсць? Акрамя новых упрыгожанняў, каштоўнасць якіх больш чым няпэўная, ёсць тут дзве перанесеныя знадворку цікавыя і старыя скульптуры. Святы Марцін, які раздзірае плашч, каб аддаць палову жабраку, і яшчэ фігура нейкага францысканца. Гэта зроблена на добрым старым узроўні.

Ды ёсць яшчэ абраз Яна Непамуцкага, таго самага, што не адкрыў каралю таямніцы споведзі каралевы, грахоў яе, і за гэта быў зрынуты з моста. Гэта рэч сапраўды майстэрская.

Побач з Янам два цікава і досыць манерна выпісаныя анёлы, адзін з якіх цягне ахапачак лілей, а другі вянчае галаву пакутніка. Наводдаль стылізаваны мост.

Вось, бадай што, і ўсё. Чаму? Чаму храм, фундаваны фантастычна багатым чалавекам, храм, які на працягу трохсот год асыпалі золатам, падзякамі, у якім працавалі найлепшыя майстры, такі бедны?

Пачатак гэтаму трэба шукаць у 1867 годзе. Бессаромная і

бязлітасная мураўёўская помста абурылася не толькі на людзей, але і на помнік іхняй культуры. Палітыка паслядоўнага вынарадавання, самадзяржаўя, праваслаўя і "народнасці" проста не магла абмінуць душы, мовы, пачуцця гожага і думкі чалавечай.

У школах загадам папячыцеля Карнілава цяпер ледзь вучылі чытаць. Касцёл Чарнаўчыцкі быў забраны пад царкву. Статуі і абразы шаснаццатага стагоддзя, зіхатлівы сонечны рэнееанс з яго водбліскам Італіі, рэнесанс, на якім ляжалі апошнія водбліскі адраджэння і гуманізму, выносілі на цвінтар і секлі, шчапалі сякерамі і кідалі ў агонь. Два дні секлі сякерамі. Два дні цягнуўся над Чарнаўчыцамі тлусты дым, два дні пухірылася, бурліла, ускіпала чорным празрыста-ясная фарба на прыўкрасных абліччах. Два дні палілі старыя кнігі.

Другую смяротную небяспеку прынесла вайна і пажар пры ўваходзе немцаў. Праз тыдзень пасля таго, як былі занятыя Чарнаўчыцы.

Нехта з беларусаў — дагэтуль невядома хто — стрэліў жаканам у нямецкага гаўптмана і параніў яго ў руку. Нехта сказаў ці, можа, гэта самім немцам здалося, што стралялі з байніцы касцёла. Вечарам таго дня салдаты аблілі муры і падлогу бензінам і падпалілі яго.

Вечар і ўсю ноч будынак зырка палаў, і полымя гэтае рвалася ў ноч. Толькі раніцай камендант даў жыхарам дазвол гасіць шэдэўр, які гінуў на вачах. На шчасце, храмы-крэпасці моцная рэч і іх не так проста знішчыць. Але і дагэтуль, як помнік варварству новага сярэдневякоўя, падпіраюць хоры абгарэлыя, закураныя калоны.

Трэцюю напасць ледзь не прынеслі сходы, што вядуць у вежы і на званіцу (таксама XVI стагоддзя і двайнік Нясвіжскага, можа, нават, збудаваны тымі самымі майстрамі). Я іх бачыў ужо крыху падноўленымі ўнізе за апошнія гады. Падноўленыя звычайнымі прыступкамі на трэцюю частку вышыні вежы.

Але і тое, што засталося, было дзівам інжынернага разліку невядомага сярэдневяковага цеслі. Вінтавыя, зробленыя з абчасаных бярвенцаў, яны толькі адным канцом кожнага бярвенца ўмацаваныя ў маленькіх нішах каменнай кладкі. Другія іхнія канцы, тыя, што стваралі вось вінта, былі проста пакладзены адзін на адзін на ўсю вышыню вежы, не звязаныя ні шыпам, ні цвіком, ні скабою, змацаваныя ў жорсткае цэлае толькі сілаю ўласнай вагі. Гэты вінт жывога дрэва нібыта пераліваўся як хацеў. Глянеш знізу — нібы жывое сонца з промнямі, то светлымі ад святла з байніц, то цёмнымі. І плахі, чым далей, тым у перспектыве, танчэйшыя. Скеміць таўшчыню кожнай плахі, колькі счасаць, якія выемкі трэба зрабіць з ніжняга боку дзеля аблягчэння ўсёй

канструкцыі, - гэта трэба было мець на плячах галаву, што добра ўмее цяміць. І гэты вінт прастаяў трыста шэсцьдзесят гадоў.

Дык вось гэтыя самыя геніяльна задуманыя сходы ледзь не загубілі ўсёй будыніны. У 1941 годзе яны знізу згарэлі на трэць. Прыступкаў не было, а восевага слупа таксама не існавала. І ўсё ж немцы, пры наступленні нашых, ухітрыліся залезці на вежы і адстрэльвацца адтуль. За час запеклага, зацятага бою па храме-крэпасці было выпушчана васемнаццаць снарадаў. Тысячы куль і асколкаў паплямілі яе ля байніц і паўсюль. Яна засталася стаяць, але трэшчыны і дагэтуль змяяцца, перасякаючы яе шматпакутныя муры.

…Лянівы і спякотны чэрвеньскі поўдзень стаяў над вежамі, калі я кіраваўся з Чарнаўчыц на Брэст. Замлела раскашавалі сады, а над імі і над белым крышталем храма-крэпасці плылі мне насустрач хмары. Нібы цяжкія беласнежныя зубры.

І ўвесь гэты абшар быў як адраджэнне ўсяго таго, што прайшло, пракаціласа над гэтым пакутным кавалкам зямлі.

XXII. Напяты світанак. Брэст

Апельсінава-залатыя расплаўленыя хлябі нёс Мухавец да недалёкага Буга. Яны імкнуліся наперад, зрэдку абліваючы халоднымі блакітнымі мазкамі.

Прыйшоў канец майму падарожжу. Нізкае яшчэ сонца ледзь пачынала прыграваць патыліцу.

Шлях быў вялікі. Шлях быў цікавы. Многа-многа адмералі ногі, шмат, дужа шмат бачылі вочы.

Нібы пазбаўлены раптам хрыбта, пагрузіўшы ў ваду натруджаныя ступакі, я ўспамінаў хмары над Прыпяццю, хвалі, што ліжуць лазу, залёныя знізу ад вільгаці платы, цыганскі натоўп, што пераліваецца, мінаючы старажытную царкву.

І песні, і нязлую размову бабуль на прызбе, і дзяўчат у вышываных сарочках, і ўсё, што завецца маім народам, самае каштоўнае, што ў мяне ёсць. І тое, што стварылі рукі ягоныя: гэтыя хаты пад знакам сонца, і франтоны калегіума, і вежы францысканаў, і гліну, што жыве на ганчарным коле, і драўляныя кветкі старой разьбы, і карункі чарнаўчыцкіх скляпенняў.

Успамінаў гэта і ведаў, што мы ўсё ж зберажом, абаронім усё гэта. Упрыгожым яго, каб жыло вечна. Толькі каб не прайшла вайна, у полымі якой згараць вежы, статуі, самі людзі, як гарэлі яны ўжо не раз. Як вежа пры татарах, і як Пінск у сялянскую вайну, і як чарнаўчыцкі шэдэўр у вайну апошнюю.

Здзіўная, знямоглая і напятая трывога вісела, была разлітая ў паветры.

Было 22 чэрвеня. Чатыры гадзіны раніцы. Бераг Мухаўца.

XXIII. Ізноў гавораць званы

На нейкі час ты кончылася для мяне, святое маё Палессе. Але я вечна буду ўдзячны тваім іржавым балотам, тваім шырокалістоўным бязмежным пушчам, тваім азёрам, залатым рэкам тваім, задуменна-пахмурым вежам і мурам, праўдзівым сведкам мінулага. І яшчэ тваім людзям, дзецям тваім чыстым, сапраўднаму сэрцу твайму і тваёй непадкупнай, вялікай, справядлівай душы.

Яны старанна працуюць. Яны светла думаюць. Яны жывуць дабром. Што б там ні было, яны жывуць дабром. І заўсёды жылі дабром, іначай не збярогся б, даўно паў бы пад ногі захопнікам і рознай навалачы, расплыўся б, знік гэты тысячы разоў выпалены, тысячы разоў попелам пушчаны край.

Я ледзь паспеў вярнуцца ад цябе. Але часам ужо зараз на світанні або ўначы, калі сплыве на імгненне сон, а то і ўдзень сярод чалавечага тлуму я раптам забываю аб усім і не чую нічога.

Пачынаюць гаварыць твае званы.

Вельмі далёкія, амаль нячутныя, яны пачынаюць гаварыць з усіх тваіх азёр. Там жывуць людзі, жыве стары палескі народ, першародны народ з вялікім сваім сэрцам, якое мы не павінны забыць.

Настане дзень, і з'явяцца над вадою шпілі, залатыя шатры і самыя белыя вежы, а тады ў патоках блакітнай пены, у карунках і сонцы багатыя і гожыя муры.

І людзі з яснымі, як вада тваіх крыніц, вачыма, не затуманенымі вайной, жахам, адступніцтвам і здрадай, будуць пяшчотна махаць рукамі, сустракаючы нас, а мы кінем ім пад ногі кветкі, сваё раскаянне і сваю любоў. І мы абдымемся з імі братнімі абдымкамі, якія не разарваць, і нідзе нішто не будзе гарэць і выбухаць, і паўсюль застануцца толькі хаты, тонучыя ў кветках, і маці з дзецьмі, і светлая радасць, і мова, і песні, і шчасце.

Ліпень, 1969 г.
Палессе — Мінск

notes

Примечания

1

Рыштунак - падлога.